ПРАВЫ І ГАРАНТЫІ НА ПЕРШЫМ ПРАЦОЎНЫМ МЕСЦЫ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 ЖНІЎНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 166 (29788)

СТУДАТРАД: ШЛЯХ, ЯКІ ВАРТА ПРАЙСЦІ КОЖНАМУ

ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай СНАПКОЎ, першы намеснік прэм'ер-міністра:

«Беларусь і Расія — гэта ў прынцыпе адзіны інтэграцыйны праект, і разглядаць ды рабіць упор на нейкія асобныя элементы (скажам, машынабудаванне або асобныя элементы вытворчасці сумесных вузлоў, па пастаўках рухавікоў, па абмене тэхналогіямі) нельга. Калі разглядаць эканоміку Беларусі і Расіі, рост нашага тавараабароту і ўзаемных інвестыцый, рух тавараў, капіталаў і людзей, то ў прынцыпе ўсё, што адбываецца ў нас сёння ў рамках саюзных праграм, тое, што адбываецца ў нас у рамках узаемадзеяння адносна процідзеяння знешнім пагрозам, — гэта і ёсць інтэграцыйныя праекты. Адзначу, што ўжо ў пачатку верасня нашы краіны маюць намер заключыць пагадненне аб крэдыце ў памеры $1,5 млрд на рэалізацыю імпартазамяшчальных праектаў».

Залаты ўраджай

Фота БелТА.

У Свіслацкім раёне сланечнік апрацоўваюць на плошчы больш за 750 гектараў. Вырошчваннем культуры займаюцца пяць гаспадарак: ААТ «Ханевічы», ААТ «Акр-Агра», камунальнае вытворчае прадпрыемства «Свіслацкая сельгастэхніка», УСП «Новы Двор-Агра» і УСП «Саўгас Вялікасельскі». Упэўненасці гаспадаркам раёна дадаюць грунтоўны падыход і супрацоўніцтва з Гродзенскім аграрным універсітэтам.

На здымку: кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт кафедры аграхіміі, глебазнаўства і сельскагаспадарчай экалогіі ГДАУ Віктар ГАНЧАРУК і дырэктар ААТ «Ханевічы» Юрый ТУРОК.

У цэнтры ўвагі

Запяканка «Здаравёнак» і каўбаскі «Абібок»

Чым парадуюць у новым навучальным годзе школьныя сталовыя?

— На працягу лета мы распрацоўвалі новае школьнае меню, — расказала журналістам дырэктар Камбіната школьнага харчавання горада Мінска Надзея ЛУКАШЭВІЧ. — З мінулага года ўзялі на сябе абавязацельства — абнаўляць школьнае меню кожную чвэрць, улічваць сезоннасць і перавагі дзяцей і бацькоў, каб ахоп школьным харчаваннем быў як мага большы. І сёлета будзем рабіць гэтак жа. Ужо распрацавана меню першай чвэрці. Яно не толькі для школ, але і для Ліцэя МУС, установ з кругласутачным знаходжаннем, кадэцкага вучылішча, гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка.

СТАР. 3

Рыштаванні Бацькаўшчыны

Каб не знікла жамчужына Палесся

Рэстаўрацыя шэдэўра неаготыкі — капліцы Ажэшкаў у Закозелі — вядзецца дзякуючы фінансаванню з фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва



Гэтым летам.

Першы раз закозельскую жамчужыну аўтару гэтых радкоў паказаў тагачасны дырэктар мясцовага сельгаспрадпрыемства Мікалай Якоўчык. Было гэта ў 2008 годзе. Калі ж Мікалай Сцяпанавіч узначаліў гаспадарку ў далёкім 1991 годзе, племзавод «Закозельскі» быў у цяжкім эканамічным становішчы, пра гістарычныя каштоўнасці ніхто не дбаў, мякка кажучы. Капліца развальвалася, яе нават не было відаць за хмызняком і бур'янам.

СТАР. 13

КАРАТКА

- Конкурс эскізаў памятнага знака ахвярам генацыду беларускага народа ў гады ВАВ аб'яўлены ў Беларусі.
- **Найбуйнейшы ў рэгіёне транспартна-лагістычны цэнтр запрацаваў у Жабінцы.**
- Мінадукацыі: флікеры абавязкова павінны быць на вопратцы школьніка.
- **Абарот велатавараў у Беларусі будзе адсочвацца з 1 снежня.**
- Нацбанк з 1 верасня будзе прадастаўляць звесткі аб валютных дагаворах упаўнаважаным органам.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ВЫСТАЯЛІ І ТАМУ ЖЫВЁМ У МІРНАЙ КРАІНЕ. АЛЕ РАССЛАБЛЯЦЦА ПАКУЛЬ РАНА»

Беларусь выстаяла ў складаны перыяд 2020 года, здолеўшы захаваць мір і парадак у дзяржаве, аднак расслабляцца пакуль рана. Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на цырымоніі ўручэння дзяржузнагарод тым, хто быў на вастрыі ў вельмі няпростыя для краіны часы, перадае карэспандэнт БелТА.

За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў, значныя заслугі ў воінскай службе і высокі прафесіяналізм кіраўніком дзяржавы ўзнагароджаны тры дзясяткі ваеннаслужачых і прадстаўнікоў сілавых структур — Міністэрства абароны, МУС, Дзяржпагранкамітэта, Камітэта дзяржбяспекі, Службы бяспекі Прэзідэнта. Высокія ўзнагароды атрымалі і шэраг грамадзянскіх асоб, якія праявілі рашучасць і мужнасць у складаных умовах пры забеспячэнні бяспекі і навядзенні парадку ў краіне ў жніўні і восенню 2020 года. Аднак спіс узнагароджаных значна шырэйшы. Ва ўказе, падпісаным Прэзідэнтам, — каля сотні чалавек. Усім ім высокія заслужаныя ўзнагароды ў найбліжэйшы час па даручэнні Прэзідэнта ўручаць прэм'ер-міністр і дзяржсакратар Савета Бяспекі.

«Усё далей углыб гісторыі сыходзяць падзеі тых незабыўных для нас з вамі, памятных, можна сказаць, дзён 2020 года. Мы ўсё больш і больш задаёмся пытаннем: дык што гэта было насамрэч? Ацэнка тым падзеям дадзена. І не мэта мая сёння паўтарацца. Скажу толькі адно. Як і чалавек ад нараджэння, так і любы народ піша сваю гісторыю. І праз некаторы час, азіраючыся назад, са шкадаваннем або гонарам канстатуем факты свайго жыцця, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У кагосьці былі старонкі не вельмі. Нехта ганарыцца пражытымі гадамі. Гэтак жа і наш беларускі народ, увогуле народы ў гісторыі даюць ацэнкі пражытаму».

Прэзідэнт канстатаваў, што з гэтага пункту гледжання нічога добрага 2020 год у сувязі з гэтымі падзеямі не дадаў. «Але беларускі народ справіўся. Мы з вамі справіліся і выстаялі. Гэта варта таго. І калі ацаніць, што гэта былі цяжкія дні, цяжкія жнівень і верасень, але мы выстаялі, гэтай старонкай з такога пункту гледжання мы можам ганарыцца», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуўся да ўдзельнікаў цырымоніі: «Перш за ўсё хачу падзякаваць нашым людзям. І перш за ўсё — вам. Усе практычна вы тут людзі ваенныя. Мы выстаялі найперш дзякуючы мужнасці, стойкасці — вашым гэтым добрым якасцям. Мы тады не думалі ні пра подзвігі, ні пра ўчынкі. Мы проста разумелі, што павінны зрабіць сваю працу. Абараніць сваю краіну, абараніць мір і спакой нашых грамадзян, для чаго мы — органы ўлады, ваенныя і людзі, якія стаяць поруч з намі, — прызначаны».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што выключна ўдзячны гэтым людзям. Ён расказаў, што пасля тых падзей даручыў адзначыць заслугі ўсіх хлопцаў, якія насмерць стаялі на вуліцы, былі траўмаваны, у тым ліку вельмі сур'ёзна, але не адступілі.

«Усіх знайсці, няхай гэта будуць тысячы-тысячы людзей, і ўзнагародзіць. Але, можа, мы кагосьці прапусцілі, не заўважылі. Усякае бывае, жыццё зараз складанае. Іх трэба знайсці — усіх, хто быў з намі на барыкадах, хто стаяў у тыя жнівеньскія, вераснёўскія дні, абараняючы наша мірнае жыццё. Нават калі яны сёння ўбіраюць хлеб на камбайнах, звольніўшыся з радоў Узброеных Сіл. Мы гэта зробім», — сказаў Прэзідэнт.

Ён зазначыў, што, як заўсёды бывае, тых, хто побач, часам не заўважаеш, здаецца, што так і павінна быць. «Так і павінна быць. Тыя, хто побач, ідуць, не азіраючыся, выконваючы загад. Думаю, настаў час вярнуць даўгі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Цяпер мы ўжо ўсвядомілі, што было б з намі. Мы тады зрабілі практычна немагчымае. На нас трэніраваліся. Але гэта была трэніроўка, гэта была прэлюдыя да тых падзей, якія адбываюцца зараз у свеце і ў прыватнасці ва Украіне. Мы выстаялі, таму сёння жывём у мірнай краіне», — падкрэсліў беларускі лідар.

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу: расслабляцца яшчэ вельмі рана, усё толькі пачынаецца: «Там была рэпетыцыя, трэніроўка, як я сказаў, прэлюдыя да асноўных падзей. Усё толькі пачынаецца. Нам не да расслаблення».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на складанае становішча ў рэгіёне і свеце, у тым ліку вакол Беларусі. «Польшча і краіны Прыбалтыкі ператварыліся, як бачыце, у палігоны для рэгулярных вучэнняў натаўскіх войскаў. Раней нейтральныя Швецыя і Фінляндыя імкнуцца ў тэрміновым парадку ўступіць у Паўночнаатлантычны альянс, лічыце — уступілі фактычна», — сказаў ён.

Пры гэтым, адзначыў Прэзідэнт, не спыняецца масіраваная гібрыдная агрэсія супраць беларускай дзяржавы. «З боку так званай збеглай нават не апазіцыі, а тых мяцежнікаў, якія хутка збеглі за межы нашай краіны. Па сваёй сутнасці гэтыя людзі з'яўляюцца адным з краевугольных камянёў палітыкі Вашынгтона і Бруселя на нашым напрамку і не толькі. І наш абавязак перад цяперашнім і будучымі пакаленнямі — зрабіць з гэтага высновы і ўсімі магчымымі сродкамі захаваць краіну, — заявіў беларускі лідар. — І мы яе захаваем, чаго б нам гэта ні каштавала. У гэтым не толькі мая, але і ваша задача. Людзі вельмі вераць у нас і ведаюць, што мы заўсёды прыйдзем на дапамогу. Забяспечым спакойнае і мірнае жыццё нашых людзей, абаронім краіну ад знешніх і таксама ўнутраных пагроз».

Па сутнасці

СТАЯЦЬ НА СВАІМ

Шпацыруючы пад шатамі грацыёзнай алеі, што вядзе да Старога гарадзенскага замка, летуценна трапляеш у палон вірлівых стагоддзяў і неадназначных думак. Вось яна, раскоша адзінага каралеўскага замка на Беларусі. Нібыта асаблівую пышнасць архітэктурнага комплексу падкрэслівае і ландшафт. Спачатку вялікакняжацкая рэзідэнцыя, а пазней — палац дынастыі Ягелонаў узвышаецца над воднай гладдзю бацькі-Нёмана і прасторамі палеткаў.

Тут, на гэтай аблюбаванай тусоўшчыкамі пляцоўцы, у юнакоў і дзяўчат прачынаецца шляхетная фанабэрыстасць і мроі аб беларускай еўрапейскасці. Ну, калі гэтая еўрапейскаць датычыцца архітэктурных стыляў — хай так. Але ж толькі не сучаснага стылю адносін да жыцця. У галоўным мы ўсё ж — славяне. Як кажа моладзь, бро, пачакай «байціць».

Давайце далонямі і сэрцам дакранемся да халодных камянёў нашых замкаў і палацаў. Да падмурка, на якім стаіць уся гэтая раскоша. Адчуваеце? То слёзы і пот нашых продкаў. Не ўсе былі канцлерамі і харунжымі... Большасць — зацятымі працаўнікамі. І як бы ні цягнуліся ў вышыню гатычныя вежы і вострыя дахі, усе велічныя замкі стаяць на зямлі. Яна трымае гэтыя магутныя сцены, дзякуючы яе багаццю з'явілася ўся тая веліч.

Я пра тое, што наш дастатак сваёй фінансавай пупавінай знітаваны са збажыной, прыбранай у свірны. Большы ўраджай — больш хлебнае жыццё. І ніякія крыптавалюты, ніякая лічбавая эквілібрыстыка не заменіць збожжа. А пах чарніла 3D-прынтараў ніколі не параб'е паху бохана хлеба. Нават сам час, нябёсы даюць зразумець — эпоха лічбы не пазбавіць чалавецтва ад голада. Толькі працай будзеш сыты.

Таму ў Беларусі падчас жніва нарады на вольным паветры — палітычны бэкграўнд. Ні па BBC, ні па CNN не паказваюць кіраўнікоў «прасунутай» Еўропы ў палях. І гэта пры тым, што там безупынна рэкламуюць чакаемы голад. Ці то гэта наўмысны інструмент уздзеяння на звычайных людзей, ці то гэта запланаваная акцыя па зачыстцы жыццёвай прасторы... Пакінем высновы для іншых суддзяў і найвышэйшага суда.

Мы — да сваіх гектараў. Да сваіх пераможцаў жніва. Да сваіх надзённых пытанняў. Іх вырашаюць. Паспрабуй не вырашыць! На пульсе жніва заўжды — рука гаспадара. Добра, што Прэзідэнт добра ведае, чым жыве поле. У гаспадарчых справах яго не падманеш.

Так, ёсць у нас аграрныя гаспадаркі рознага ўзроўню. І справа не ў літарах перад назвай. ААТ, СВК, агрохолдынг. Справа ў метадах гаспадарання. Вось, напрыклад, заходнія нашы гаспадаркі. Выдатнікі. Бал глебы большы? Так. Але — і без дыктатуры ніяк. Тэхналогій і метадаў кіравання. Павінен чалавек быць улюбёны ў справу. Быць гаспадаром. Калі гэта кіраўнік, то ўся гаспадарка ў яго — нібы лялька. Калі гэта звычайны кіроўца, то машына — нібы сёння з канвеера. Так і атрымліваецца. У гаспадарцы імя Крамко інфраструктура, у тым ліку сыну-кіраўніку, засталася ў спадчыну ад бацькі-кіраўніка. Яе ўмела падтрымліваюць. А сэканомленныя грошы — на развіццё. Чарговая лакацыя Прэзідэнта — Пружанскі раён. Там Аляксандр Лукашэнка пазнаёміўся з вясковымі кіроўцамі, адзін з іх — Саша — першы. Так і напісана на кабіне грузавіка. І грузавік — дагледжаны.

Мы павінны да свайго ставіцца з павагай. Ці не з гэтага і пачынаецца патрыятызм? Адкажыце, мы сваіх бацькоў любім за штосьці альбо проста любім? А да кутка свайго дзяцінства трапятліва ставімся чаму? Ён жа не нагадвае нам канарскія берагі альбо пражскія вулачкі. Ён нагадвае нам нас саміх. Якія мы — такія і рэчы, што мы робім. Паважай сваё, каб цябе паважаў астатні свет. Так, наша тэхніка больш сціплая, чым іншаземная. Але і больш танная ў абслугоўванні. У мяне ёсць калега, які наўмысна купляе толькі беларускія яблыкі альбо бульбу. І сапраўды, чаму сваім рублём мы павінны падтрымліваць эканоміку іншых краін? Няўжо свайго няма? Павінна быць. І кропка. Так настойвае Прэзідэнт. Нават клімат у нас стаў больш спрыяльны для сліў і кавуноў. А яблыкі — гэта ж садовая аксіёма. Ужо другое дзесяцігоддзе запар мы спрабуем пазбавіцца ад польскай яблычнай акупацыі нашых крам. Вось з мяснымі далікатэсамі атрымалася. А садавіна застаецца яшчэ ўсё той жа. Іншаземнай. У планах — вырошчваць да мільёна тон садавіны ў год. Цяпер актыўна зоймуцца інтэнсіўным садаводствам. Салодкага плёну чакаць не менш чым тры гады.

А вось пацяпленне ў вясковым будаўніцтве ўжо наступіла. Кіраўнік краіны ўжо падпісаў адмысловы загад. Драўніна, у тым ліку будаўнічая, павінна стаць таннейшай для вяскоўцаў. Сваё жыллё, свая тэхніка, свая краіна. Свой хлеб. Хлеб Бацькаўшчыны. «Бацькава булка» — менавіта пад такой назвай на Гродзеншчыне прайшоў хлебна-музычны фестываль. Беларусы так і кажуць. Калі ёсць хлеб, то будуць і песні. Ад сябе дадам: тады і замкі, і палацы таксама будуць. Заўсёды дыхаецца спакойна, калі паветра з водарам хлеба.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Як палепшыць сістэму адукацыі?

Пытанне абмяркоўвалася на калегіі Адміністрацыі Прэзідэнта

Існуючая сістэма цэнтралізаванага тэсціравання, нягледзячы на ўсе навацыі па яе ўдасканаленні, не заўсёды дае магчымасць бачыць абітурыента пры адборы ў ВНУ. Таму трэба найбліжэйшым часам выпрацаваць падыходы, як яе змяніць да лепшага. Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА на калегіі адміністрацыі, перадае карэспандэнт БелТА.

Фота БелТА.

Ігар Сергеенка расказаў, што напярэдадні на нарадзе аб развіцці нацыянальнай сістэмы адукацыі Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна выпрацаваць дакладную, празрыстую, простую, зразумелую ўсім сістэму адбору ў ВНУ. Бо ў далейшым ад тых людзей, якія туды прыйдуць, будуць залежаць і ўраджай, і вытворчыя паказчыкі, і імпартазамяшчэнне, і шмат іншага. «Была пастаўлена канкрэтная задача нам прапрацаваць яшчэ раз гэтае пытанне пад эгідай Адміністрацыі Прэзідэнта да новага года. Але мы разумеем, што гэта трэба зрабіць значна раней. Яшчэ раз уважліва вывучыць гэтую праблему і вызначыцца — ці захоўваць сістэму цэнтралізаванага тэсціравання ў тым выглядзе, як ёсць, ці яна павінна быць зменена і прапанавана ў тым фармаце, як планавалі з наступнага года, ці яшчэ нейкія навацыі ўнесці. Кіраўніком дзяржавы было падкрэслена, што мы падчас правядзення ўступнай кампаніі павінны бачыць выпускніка. Існуючая сістэма ЦТ, якая функцыянуе 20 гадоў і да якой усе прывыклі, у пэўнай ступені не дае магчымасці тое зрабіць, — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар ЛУЦКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, лічыць, што сістэма адукацыі Беларусі працуе ў цэлым зладжана, аб чым сведчаць многія пазітыўныя факты. Сістэма адукацыі, паводле яго слоў, знаходзіцца пад пільнай увагай Адміністрацыі Прэзідэнта. «Ад таго, якой яна будзе, якія адказы будзе даваць на выклікі часу, залежыць, ці сфарміруем мы здаровую і адукаваную нацыю, якая ўмее абараніць свае ідэалы, свабоду і незалежнасць, забяспечыць паступальнае развіццё краіны і грамадства», — заявіў намеснік кіраўніка.

Паводле яго слоў, за апошнія гады дзяржавай шмат зроблена для развіцця адукацыі: створана неабходная заканадаўчая база, забяспечана стабільнае фінансаванне, навучэнцам і педагогам аказваецца сацыяльныя падтрымка. «Па вялікім рахунку, сістэма працуе зладжана. Сведчаннем таму з'яўляецца ўмацаванне пазіцый нацыянальнай адукацыі на сусветным узроўні, рост колькасці замежных грамадзян, якія выяўляюць жаданне вучыцца ў нас, перамогі нашых хлопцаў і дзяўчат на міжнародных алімпіядах, а таксама тое, што нашых выпускнікоў з рукамі і нагамі, калі можна так сказаць, гатовыя забраць да сябе многія замежныя кампаніі, у тым ліку і за мяжой», — канстатаваў Ігар Луцкі.

Запяканка «Здаравёнак» і каўбаскі «Абібок»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У меню першай чвэрці засталіся стравы, што прыйшліся дзецям даспадобы, такія як «шашлычок школьны» з філе кураняці, перапёлчыны яйкі, тварожна-шакаладная запяканка. Пры гэтым з'явяцца і новыя стравы: «Мітболы сытныя», «Курачка пікантная», «Біфштэкс цудоўны», «Кракет асаблівы», запяканка «Здаравёнак» і каўбаскі «Абібок». А меню буфетнай прадукцыі папоўніць новы ягадны пірог: з пясочнага цеста з прымяненнем працёртай ягады.

Па словах Надзеі Лукашэвіч, навучэнцам 5—11-х класаў абед прапануюць на выбар — з супам ці без яго. «У кожнай нашай школе мы гэты выбар забяспечваем, — запэўніла яна. — Камбінат школьнага харчавання адгукнуўся і на запыт зрабіць стравы больш прывабнымі, духмянымі і пікантнымі. Таму сёлета кухары будуць прымяняць не толькі зяленіва пятрушкі, але і папрыку».

Надзея Лукашэвіч паведаміла, што ў новым навучальным годзе працягнецца акцыя «Чыстая талерка», якая стартавала летась: «За з'едзеную поўнасцю ежу прапануем дзіцяці сімвалічны прыз. Мы заўважылі, што ў дні, калі праходзіць акцыя, школьнікі ядуць больш ахвотна, вельмі ўважліва ставяцца да ежы і ў нас практычна на нуль зведзены адходы».

> Дарэчы, калі раней галоўнай прычынай, з якой дзеці адмаўляліся есці ў школе, паводле анкетавання, быў вонкавы выгляд кухараў, то цяпер гэта прэтэнзіі да якасці ежы і таго, што ежа падаецца на стол халоднай.

— З вонкавым выглядам кухараў праблема вырашылася, сёння, напрыклад, абавязковым патрабаваннем пры раздачы ежы з'яўляецца выкарыстанне аднаразовых пальчатак, — заўважае **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА.** — А вось якасць страў залежыць і ад адказнасці кухараў, і ад сыравіны, якая набываецца. З няякаснай сыравіны атрымаць якасную і смачную страву немагчыма.

Для дзяцей мае значэнне ўсё: як аформлена памяшканне, дзе яны харчуюцца; сервіроўка сталоў, які посуд пры гэтым выкарыстоўваецца.

Ала Малахава ўпэўнена, што выбар страў у школьнай сталовай павінен быць. Трэба хоць бы мінімальна ўлічваць смакавыя прыхільнасці дзяцей. «Дзеці нашы сёння не галодныя, у іх павышаныя патрабаванні да разнастайнасці харчавання, яны хочуць, каб ім прапаноўвалі сучасныя стравы. Калі ў меню прысутнічае нейкая страва, якая пастаянна адпраўляецца ў адходы, ніякая агітацыя не дапамагае і дзеці ўпарта яе ігнаруюць, значыць, яе трэба замяніць. Чаму павінен быць выбар? Калі дзіця, напрыклад, не есць рыбу дома, то не будзе яе есці і ў школьнай сталовай. Значыць, мы выкідаем грошы на вецер: або дзяржаўныя, або бацькоўскія. Такое нельга дапускаць. Трэба працаваць па меню заўтрашняга дня з магчымасцю выбару. Увогуле меню павінна быць дынамічным.

А вось наконт перспектыў з'яўлення ў школе вегетарыянскага меню Ала Малахава катэгарычная: «Сапраўднае вегетарыянства — вельмі дарагое задавальненне, таму што прадукты, якія выключаюцца з рацыёну, трэба паўнацэнна замяняць. А ў нас часцей за ўсё проста адмаўляюцца ад тых ці іншых прадуктаў. Таму і педагогам, і ўрачам-педыятрам неабходна размаўляць і пераконваць бацькоў у тым, што пераводзіць дзяцей на вегетарыянства — недапушчальна. У 18 гадоў няхай яны самі вырашаюць для сябе пытанне, ці падыходзіць гэта ім. Калі дзіцяці патрабуецца асаблівая дыета, педыятр павінен тое вызначыць, даць рэкамендацыю і ў школе яе выканаюць. Больш мы ніякіх адхіленняў ад прыкладных рацыёнаў у школе не дапускаем».

Пытанне наконт таго, ці могуць бацькі адмовіцца ад школьнага харчавання, узнімаецца з году ў год. Тлумачэнні з такой нагоды даваліся неаднаразова. **«У нас няма ніякага прыгоннага права і прымусовай сістэмы арганізацыі харчавання для навучэнцаў, — падкрэслівае намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.** — Можна адмовіцца ад школьнага харчавання без тлумачэння прычын, але бацькам трэба самім паклапаціцца аб карысным і збалансаваным харчаванні для свайго дзіцяці. Калі яны гатовыя самастойна арганізаваць паўнацэннае, здаровае харчаванне, я не думаю, што будуць нейкія праблемы з адміністрацыяй. І ніякіх даведак ад педыятра прадастаўляць не трэба».

«Асартымент буфета павінен адпавядаць прынцыпам здаровага харчавання».

«Выбар страў у школьнай сталовай павінен быць. Трэба хоць бы мінімальна ўлічваць смакавыя прыхільнасці дзяцей».

«Калі дзіця не хоча харчавацца ў школьнай сталовай, мы не прымушаем, а гаворым аб тым, што для здароўя дзіцяці лепш атрымліваць гарачае харчаванне, якое адпавядае ўсім прынцыпам здаровага харчавання», — тлумачыць Ала Малахава.

Альтэрнатыўны варыянт — школьны буфет, дзе прадстаўлены шырокі асартымент прадукцыі. Напаўненне школьных буфетаў заканадаўча ўрэгуляванае. «Раней рэгулявалася нават колькасць найменняў аднаго і таго ж прадукту, але з часам ад гэтага адмовіліся, — заўважыла Ала Малахава. — У нас прапісана, што ў асартыменце павінны быць розныя бутэрброды, халодныя закускі, кісламалочныя прадукты, узбагачаныя макра- і мікранутрыентамі, садавіна і г. д. Могуць быць сухія злакавыя сняданкі. Асартымент буфета павінен адпавядаць прынцыпам здаровага харчавання. У дачыненні да кандытарскіх вырабаў і прысмакаў дзейнічае жорсткае абмежаванне: у буфетах можа быць не больш за 10 найменняў прадукцыі прамысловай вытворчасці.

Па словах Алы Малахавай, прысмакі ў прынцыпе не могуць прызначацца для харчавання дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту, таму што яны не адпавядаюць прынцыпам здаровага харчавання.

Што да прадукцыі ўласнай вытворчасці, яна можа рэалізоўвацца ў неабмежаванай колькасці. Тым больш што пры выпечцы звычайна выкарыстоўваюць розныя карысныя начынкі: яблыкі, капусту, курагу і г. д. «У дадзеным выпадку асартымент мы не абмяжоўваем, нягледзячы на тое, што гэта мучны выраб. Справа ў тым, што ён не ўтрымлівае гідрагенізаваныя тлушчы, забароненыя ў харчаванні дзяцей. Наша прамысловасць грашыць тым, што выпечка (пячэнне і іншая прадукцыя) утрымлівае такія тлушчы, гэта значыць, што яна гатуецца на маргарыне. А ў нас усё гатуецца на раслінным алеі або сметанковым масле», — растлумачыла Ала Малахава.

Акрамя таго, у буфетах дзейнічаюць абмежаванні па прадажы піцы, смажанак, сасісак у цесце і падобных вырабаў. «Адзін з гэтых відаў прадукцыі можа рэалізоўвацца ў буфеце не часцей за два разы на тыдзень», — дадала спецыяліст санэпідслужбы. Яна падкрэсліла, што бацькам таксама трэба сачыць за тым, што іх дзеці купляюць у буфеце, ці карысная гэта ежа.

У новым навучальным годзе харчаваннем будуць ахоплены па краіне 1 млн 85 тысяч навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У садах будуць харчавацца каля 391 тысячы выхаванцаў. «Да пачатку навучальнага года былі праведзены плановыя рамонтныя работы, заменена ўстарэлае тэхналагічнае і халадзільнае абсталяванне, кухонны інвентар і посуд. Аб'екты грамадскага харчавання ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі будуць функцыянаваць у штатным рэжыме, іх больш як шэсць тысяч. У мэтах забеспячэння навучэнцаў збалансаваным, здаровым харчаваннем у рэгіёнах распрацоўваецца прыкладны двухтыднёвы рацыён харчавання. Навучэнцам усіх катэгорый прадастаўляецца адзіны рацыён харчавання, незалежна ад таго, хто аплачвае харчаванне: бацькі або дзяржава», — праінфармаваў Аляксандр Кадлубай.

«Чаму павінен быць выбар? Калі дзіця, напрыклад, не есць рыбу дома, то не будзе яе есці і ў школьнай сталовай. Значыць, мы выкідаем грошы на вецер: або дзяржаўныя, або бацькоўскія. Такое нельга дапускаць. Трэба працаваць па меню заўтрашняга дня з магчымасцю выбару. Увогуле меню павінна быць дынамічным».

Што датычыцца грашовых нормаў расходаў на харчаванне, то яны залежаць ад тыпу ўстановы адукацыі і часу знаходжання ў ім выхаванца. Нядаўна яны павялічыліся ад 9 да 13 працэнтаў. Напрыклад, ва ўстановах дашкольнай адукацыі — на 10 працэнтаў, сярэдняй адукацыі — на 11 працэнтаў. «Кошт харчавання ў звычайных садках выхаванцаў ва ўзросце ад аднаго да трох гадоў пры знаходжанні ва ўстанове 10,5 гадзіны складае 3,2 рубля ў дзень, у санаторных садках і групах для дзяцей 3—7 гадоў са знаходжаннем 12—24 гадзіны — 6,5 рубля», — расказаў Аляксандр Кадлубай.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Японіі пераглядаюць палітыку па адмове ад будаўніцтва новых АЭС

Улады Японіі прынялі рашэнне перагледзець сваю энергетычную палітыку, якая прадугледжвае адмову ад будаўніцтва ў краіне новых АЭС. Пра гэта заявіла канцылярыя кіраўніка японскага ўрада Фуміё Кісіда, паведамляе ТАСС.

Адзначаецца, што з 2023 года ўлады краіны будуць імкнуцца аднавіць работу сямі АЭС, функцыянаванне якіх было прыпынена з-за аварыі на «Фукусіма-1». Таксама ўрад дзяржавы разгледзіць магчымасць прадаўжэння эксплуатацыі энергаблокаў, узрост якіх перавышае 60 гадоў. Акрамя таго, будзе вывучана магчымасць распрацоўкі і будаўніцтва атамных рэактараў новага пакалення.

Цяпер у Японіі часткова дзейнічаюць 10 з 17 існуючых у краіне АЭС.

Курс на адмову ад будаўніцтва новых атамных электрастанцый у Японіі быў прыняты пасля аварыі на АЭС «Фукусіма-1», якая адбылася ў 2011 годзе. Тады ж японскія ўлады ўзмацнілі жорсткасць патрабаванняў да ўжо існуючых атамных аб'ектаў. Так, кампаніям-аператарам АЭС неабходна было ўмацаваць інфраструктуру супраць тэрактаў і стыхійных бедстваў, а таксама прыпыніць работу рэактараў, тэрмін эксплуатацыі якіх перавысіў 40 гадоў. Аднаўленне іх функцыянавання на сёння магчымае не больш як на 20 гадоў і толькі пасля дбайнай праверкі і атрымання адпаведнага дазволу.

Шайгу назваў прычыну запаволення тэмпаў наступлення РФ у ходзе спецаперацыі

Міністр абароны Расіі Сяргей Шайгу, выступаючы на нарадзе міністраў абароны краін ШАС, заявіў, што запаволенне тэмпаў наступлення ў рамках спецаперацыі ва Украіне было свядомым рашэннем, якое звязана з імкненнем звесці да мінімуму колькасць ахвяр сярод мірнага насельніцтва. Пра гэта паведамляюць РІА «Навіны».

Шайгу падкрэсліў, што падчас спецаперацыі Расія строга выконвае нормы гуманітарнага права і робіць усё, каб не дапусціць ахвяр сярод мірных людзей. «Безумоўна, гэта запавольвае тэмпы наступлення, але мы ідзём на гэта свядома», — адзначыў кіраўнік расійскага абароннага ведамства.

Ён таксама ўдакладніў, што расійскім бокам на вызваленых тэрыторыях аказваюцца гуманітарная дапамога, садзейнічанне ў аднаўленні інфраструктуры і сістэм жыццезабеспячэння.

Разам з тым кіраўнік Мінабароны РФ звярнуў увагу на тое, што ўкраінскія баевікі выкарыстоўваюць тактыку выпаленай зямлі і груба парушаюць міжнародныя нормы. Так, у якасці агнявых пазіцый яны выкарыстоўваюць жылыя дамы, школы, дзіцячыя садкі, бальніцы, а насельніцтвам прыкрываюцца як жывым шчытом. Шайгу дадаў, што УСУ таксама вядуцца мэтанакіраваныя абстрэлы населеных пунктаў, каб нанесці як мага большую шкоду грамадзянскім асобам і інфраструктуры.

Кіраўнік ведамства яшчэ раз падкрэсліў, што пастаўкі Украіне зброі і ваеннай тэхнікі з боку заходніх краін толькі зацягваюць канфлікт і павялічваюць колькасць ахвяр.

Захарава папярэдзіла Латвію аб расколе ў грамадстве з-за зносу савецкіх помнікаў

Улады Латвіі, аддаючы загад аб зносе помніка Вызваліцелям Рыгі, могуць прывесці да расколу ўнутры краіны. Такое меркаванне выказала афіцыйны прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Расіі Марыя Захарава ў эфіры радыё Sputnik.

На думку дыпламата, латвійскія ўлады спрабуюць дэманціраваць гістарычную памяць, на фоне гэтага яны ўжо перапісалі падручнікі, а цяпер кантралююць грамадскую думку ў маладых пакаленняў.

«Ветэраны — удзельнікі баявых дзеянняў і работнікі тылу, ахвяры канцлагераў сышлі. Пакаленне сышло. Засталося толькі адно — візуальныя помнікі, якія нагадвалі, расказвалі і неслі інфармацыю па гэтай гістарычнай лініі», — сказала Захарава.

Прадстаўнік МЗС РФ лічыць, што людзі, якія ўзначальваюць Латвію, не спыняць сваю «місію», нягледзячы нават на тое, што разумеюць, чым рызыкуюць.

«Яны рызыкуюць поўным расколам унутры сваёй краіны. Абсалютным, не проста часовым парушэннем грамадскага спакою, а нацкоўваннем людзей і немагчымасцю гарманічнага існавання грамадзян сваёй жа краіны, якія ведаюць гісторыю, якія памятаюць...» — дадала Захарава.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ КАМБАЙНА

У Магілёўскай вобласці працуе спецатрад, які дапамагае тым, хто адстае, убіраць ураджай

Падзея не ў тым, што атрад камусьці дапамагае, а ў тым, што робіць гэта на спісанай тэхніцы, што, як красамоўна выказваецца Алег ГРУДАЎ, дырэктар ААТ «Задняпроўскі міжрайаграсэрвіс», у складзе якога працуе гэты атрад, «пад тынам валялася». Прадпрыемства спецыялізуецца на рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, яго работнікі вяртаюць да жыцця нават безнадзейныя трактары і камбайны. Прычым не толькі вяртаюць, але і самі садзяцца на іх і едуць на палі.

Крыўдна, што даўжнікоў у прадпрыемства пры ўсіх яго намаганнях дапамагчы з аператыўным рамонтам тэхнікі, як той казаў, вагон і маленькая цялежка. У тым ліку і такіх, з якіх практычна нічога не возьмеш акрамя нікому не патрэбнага ламачча. Што рабіць — прыходзіцца браць.

— Гэта тыя трактары і плугі, якія ідуць на спісанне, часта ў разабраным выглядзе, — расказвае дырэктар. — А мы забіраем гэты металалом за даўгі, збіраем і працуем.

Прадпрыемства заўсёды аднаўляла тэхніку для гаспадарак вобласці. Летась літаральна з дэталяў тут сабралі тры камбайны і паехалі на іх убіраць ураджай — такім чынам вярталі дэбіторскую запазычанасць.

— Сёлета губернатар папрасіў пашыраць нашу дзейнасць, і мы амаль з нічога сабралі яшчэ тры камбайны, — кажа Алег Аляксандравіч. — Наогул, для падтрымкі тых, хто адстае, з нашых работнікаў было сфарміравана два спецатрады. Адзін на дзесяць энерганасычаных трактарах «МТЗ-3022» працуе на ворыве, другі на «рэанімаваных» пяці зернеўборачных камбайнах КЗС-12 і адным John Deere падтрымлівае на ўборцы адсталыя гаспадаркі па ўсёй вобласці.

Падобных атрадаў, напэўна, няма і за межамі вобласці. Звычайна дапамагаюць гаспадаркі адна адной, але толькі пасля таго, як сваю работу зрабілі. А тут нешта накшталт хуткай дапамогі. Прадпрыемства адпраўляе тэхніку на слабыя ўчасткі выключна са сваімі людзьмі, таму што не сумняваецца ў іх. Што датычыцца вернутых да жыцця машын, то свае работнікі лепш адчуваюць жалезнага каня, бо перабралі яго па дэталях. Наогул, у любой тэхнікі павінен быць адзін гаспадар. Ён тады і яе настрой ведае.

Фота Дзіяны ГАРАНІНАВАЙ.

Кіраўніцтва Круглянскага раёна, райагратэхсэрвісу і прадстаўнік прафсаюза ўшаноўваюць тысячнікаў прадпрыемства.

Сёлета механізатары міжрайаграсэрвісу дзе толькі не працавалі. Дапамаглі гаспадаркам у Глускім, Асіповіцкім, Кіраўскім, Быхаўскім, Чавускім, Горацкім, Круглянскім раёнах — усім, каму не хапала тэхнічных сродкаў. Супрацоўнікі прадпрыемства Сяргей Аўчарэнка і Алег Міхневіч нават тысячнікамі сталі. Працавалі ў Асіповіцкім, Кіраўскім, Быхаўскім, Круглянскім раёнах і з узрослым вынікам выйшлі ў лідары.

— Зімой яны працуюць у нас слесарамі, а летам садзяцца на камбайны, — удакладняе дырэктар. — Да нас яны працавалі ў калгасах. Зарплата здзельная: калі чалавек не лянуецца, жадае добрую капейку атрымаць, даём яму такую магчымасць. Нашы тысячнікі за жнівень атрымаюць тысячы па чатыры.

Акрамя трактароў і камбайнаў у рабоце на палях задзейнічана дзевяць МАЗаў прадпрыемства. Яны дапамагаюць аператыўна адвозіць збожжа на элеватары. Упершыню задзейнічана тэхніка на ворыве. Супрацоўнікі міжрайаграсэрвісу сёлетняй вясной рыхтавалі глебу да пасеву яравых, зараз аруць пад азімыя. І, вядома, ад асноўных абавязкаў ніхто не вызваляў — кантроль і рамонт тэхнікі вядуцца пастаянна. Перад пачаткам пасяўной 15 мабільных брыгад працавалі ў сельгаспрадпрыемствах. У іх мэты ўваходзіла правядзенне тэхабслугоўвання ўсіх энерганасычаных трактароў.

У рабоце прадпрыемства задзейнічаны выключна высокакваліфікаваныя вопытныя кадры, больш чым палова — з вышэйшай адукацыяй. Задняпроўскі міжрайаграсэрвіс — добрая пляцоўка для стажыроўкі кадраў. Прадпрыемства з'яўляецца тэхнічным цэнтрам такіх вядучых прадстаўнікоў айчыннага аўтапрама, як «МТЗ», «Гомсельмаш». Энерганасычаная тэхніка ў рамонце і тэхабслугоўванні патрабуе высакакласных электроншчыкаў, іншых спецыялістаў — і яны тут ёсць.

Апошнім часам адчуваліся перабоі з запчасткамі, але прафесіяналаў гэта не пужае. Калі няма паставак з-за мяжы неабходных матэрыялаў і дэталяў, яны замяняюцца сваімі вырабамі. Нават у імпартных мадэлях. Узамен ідзе нешта беларускае або расійскае. І тэхніка працуе.

— Ва ўсіх гэтых абмежаваннях ёсць і станоўчы бок, які служыць штуршком да развіцця, — кажа Алег Грудаў. — Мы прывыклі спадзявацца і абапірацца на кагосьці, але ж трэба прасоўваць сваю вытворчасць, разлічваць на сябе і свой досвед. Нашы слесары выйшлі ў тысячнікі на жніве не на замежнай тэхніцы, а на гомельскіх камбайнах. Наша тэхніка не горшая.

Дарэчы, калгасы або фермеры маюць магчымасць не толькі скарыстацца паслугамі прадпрыемства, але і купіць адноўленую тэхніку. Летась, напрыклад, такі прэцэдэнт быў. Здзелка выгадная, адноўлены трактар або камбайн каштуе ў некалькі разоў танней, а працуе не горш за новы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

У ТЭМУ

На Магілёўшчыне завершана ўборка на больш чым 86 працэнтах плошчаў збожжавых і зернебабовых. У сярэднім за суткі ўбіраецца амаль тры працэнты пасяўных плошчаў. У вобласці ставіліся планы пераадолець сёлета мільённую мяжу. І прагнозы, здаецца, спраўджваюцца. Для параўнання: летась было сабрана 975 тысяч тон зерневых і зернебабовых.

Хлебаробы Шклоўскага і Магілёўскага раёнаў першымі намалацілі кожны больш за 100 тысяч тон збожжа. Шклоўскі раён лідзіруе таксама па ўраджайнасці, сярэдняя тут складае 50 ц/га. Сярод гаспадарак самыя высокія паказчыкі па ўраджайнасці ў кіраўскага СВК «Рассвет» імя К. Арлоўскага» (63,2 ц/г) і бабруйскага СВК «Гігант» (68 ц/г).

Запаветны рубеж у тры тысячы тон на экіпаж яшчэ на мінулым тыдні пераадолелі камбайнеры СВК «Рассвет» імя К. Арлоўскага» браты Андрэй і Сяргей Дразды і экіпаж Мікалая Дарэчкіна і Яўгена Сарбаева з СВК «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна. На гэтым тыдні да лідараў далучыліся Алег Вяроўкін і Максім Быкаў — камбайнеры СВК «Гігант» Бабруйскага раёна.

На раніцу 23 жніўня на Магілёўшчыне было таксама 17 экіпажаў двухтысячнікаў і 250 — тысячнікаў.

Асобныя гаспадаркі ўжо закончылі жніво і дапамагаюць іншым. У іх ліку слаўгарадскі КСУП «Наша Радзіма», дзе прыбралі свае гектары і паехалі дапамагаць агракомплексу «Светлы» ў Чэрыкаўскі раён. Салідарнасць хлебаробаў прадыктавана жаданнем дапамагчы суседзям хутчэй завяршыць уборку збожжавых і пачаць закладку ўраджаю наступнага года.

На працягу ўсёй уборачнай працоўны дух на палях падтрымліваюць прадстаўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улад, грамадскіх арганізацый. Толькі па лініі прафсаюзаў падзякамі і грашовымі прэміямі на 22 жніўня на Магілёўшчыне былі адзначаны 128 перадавікоў. Прафсаюзы вядуць кантроль таксама за стварэннем камфортных умоў для работы камбайнераў, кіроўцаў і ўсіх, хто задзейнічаны ва ўборачнай кампаніі.

— Сёння ўсе мы, пачынаючы ад кіраўнікоў пярвічных прафсаюзных арганізацый, выязджаем у палі, каб забяспечыць бяспеку працы работнікаў уборачнай кампаніі, — падкрэсліў **старшыня Магілёўскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Дзмітрый ЯНКОЎ.** — На пастаянным кантролі прафсаюзаў — наяўнасць гарачага харчавання і ўмовы прыёму ежы, работа душавых і туалетных пакояў, стан камбайнаў і экіпіроўка камбайнераў, кіроўцаў. Вылучаем сродкі для набыцця кухоннага інвентару, фінансава заахвочваем перадавікоў.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона

Лот № 1 – офис (административное помещение) общей площадью 15,6 кв. м, инв. номер 200/D-193558, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 6

Начальная цена с НДС 20 % – 34 782,00 бел. руб.

Лот № 2 – офис (административное помещение) общей площадью 115,6 кв. м, инв. номер 200/D-193559, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 7.
Условие аукциона: при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона (кондиционер Mitsubishi FDCV A302HENR (наружный блок) (инвентарный номер 50043395)), на сумму 926,36 бел. руб. с НДС 20 %

Начальная цена с НДС 20 % – 248 400,00 бел. руб.

Лот № 3 – кафе (помещение общественного питания) общей площадью 114,4 кв. м, инв. номер 200/D-193567, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 14

Начальная цена с НДС 20 % – 245 160,00 бел. руб.

Обременение по лотам 1–3: 1. Аренда. Подробная информация у Продавца.
2. Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 рабочих дней после проведения аукциона (по лоту № 1) не позднее 5 рабочих дней после проведения аукциона (по лотам № 2–3).
Срок оплаты: не позднее 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи (по лоту № 1) не позднее 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи (по лотам № 2–3).
Передача предмета аукциона осуществляется не позднее 5 рабочих дней (по лоту № 1) и 3 рабочих дней (по лотам № 2–3) после полной оплаты покупателем стоимости предмета аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.08.2022 г.

Дата и время проведения аукциона	**09.09.2022** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**07.09.2022** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «ТЕНКИНВЕСТ»,

опубликованной в газете «Звязда» от 01.04.2022 г. по объекту «Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Л. Беды – ул. 1-я Поселковая – ул. Восточная – ул. 1-я Базисная в г. Минске» 5-я очередь. Жилой дом № 5 по генплану.

Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений с учетом лоджии составляет сумму в белорусских рублях эквивалентную **1 500 долларам США**. Подлежащая оплате сумма определяется по согласованному сторонами курсу белорусского рубля к доллару США на дату поступления денежных средств на счета Застройщика.

Количество объектов строительства для заключения договоров в совокупности 20 (двадцать) штук из которых 1-комнатные квартиры общей площадью по СНБ от 46,61 до 48,80 кв. м, 2-комнатные квартиры общей площадью по СНБ от 61,79 до 63,64 кв. м, 3-комнатные квартиры общей площадью по СНБ от 78,98 до 79,42 кв. м.

Обязательным условием для заключения договора долевого строительства на жилое помещение является приобретение не менее одного машиноместа в многоэтажной гараж-стоянке по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 46.

Условия оплаты: оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно либо в установленный договором период по графику платежей.

По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

Условия возможного изменения цены строительства застройщиком в одностороннем порядке: основанием для изменения застройщиком в одностороннем порядке цены договора является нарушение дольщиком условий предоставления скидки.

Информация о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: обязанность привлекать граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, при долевом строительстве объекта у Застройщика отсутствует.

Условия ознакомления с информацией по проекту, порядок приема и регистрации заявлений на заключение договоров:

Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству, можно на сайте: www.4sezona.by, а также в отделе продаж Застройщика «4 Сезона»: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45, тел. +375 44 782-07-07, где также можно подать заявление на заключение договора в рабочие дни – с понедельника по пятницу; рабочие часы – понедельник – пятница с 9.00 по 17.30; обед – с 12.00 по 13. 00, выходные дни – суббота, воскресенье.

УНП 191116618

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

12 сентября 2022 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, д. 70 (конференц-зал)

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

О внесении изменений и дополнений в условия крупных сделок (взаимосвязанных сделок).
Начало работы собрания в 10.00
Регистрация участников собрания с 9.30 до 9.50

Наблюдательный совет
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».
УНП 500021638

Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню

Смерць хадзіла за ёй па пятах

«Дзіўна, але факт: чым далей у мінулае сыходзіць праклятая вайна, тым часцей яна ўспамінаецца, нават сніцца», — кажа 97-гадовая Марыя Пятроўна СТРУК. Смерць і сапраўды хадзіла за ёй па пятах, а гора, можна сказаць, — з маленства. У 14 гадоў дзяўчынка асіраціла, разам са старэйшай сястрой Верай дапамагала маці гадаваць малодшых братоў і сясцёр. У 17 стала сувязной партызанскага атрада, а потым разведчыцай і памочніцай кухара, была паранена, двойчы хварэла на тыф.

— Помню, быў час: нутром адчувала, што мяне ў любы дзень могуць вывезці на прымусовыя работы ў Германію, — расказвае Марыя Пятроўна. — Каб пазбегнуць гэтага, пайшла працаваць лесарубам (у Нямеччыну іх не вывозілі). Дык вось іду неяк раз на работу — чую, што хтось даганяе, удакладняе прозвішча, пытаецца, ці хачу паслужыць савецкай уладзе? А я і не знаю, што адказаць. Думаю: раптам правакацыя, раптам перада мной паліцай? Але ж глянула ў твар незнаёмцу і ўжо не сумнявалася: гэта наш, партызан. Мы разгаварыліся. Я згадзілася дапамагаць, атрымала пароль для сувязі, а вось заданняў ад партызан — спачатку ніякіх.

На сэрцы вельмі неспакойна было, аж пакуль аднойчы вечарам у дзверы не пастукалі. Адчыніўшы, дзяўчына ледзь не закрычала: на ганку стаяў мясцовы... паліцэйскі Іван. «Няўжо нехта выдаў, і ён прыйшоў па мяне?» — спужалася Марыя.

— Але ж страх тады змяніўся на здзіўленне, — успамінае Марыя Пятроўна, — бо гэты паліцай назваў партызанскі пароль і прынёс мне першае

Памятны знак ва ўрочышчы Міхерова.

адказнае даручэнне. Мне трэба было звольніцца з лясгаса і ўладкавацца кухарам у адну з нямецкіх арганізацый, якая займалася вярбоўкай і падрыхтоўкай на фронт палякаў. Перада мной стаяла задача: пасябраваць з іх старэйшым і паспрабаваць пераманіць на бок партызан.

Па словах Марыі Струк, барак-казарма знаходзілася тады ў Маларыце за чыгуначным пераездам. Па папярэдніх звестках, палякаў было больш за трыццаць.

— Мяне папярэдзілі, што адно неабачлівае дзеянне можа каштаваць жыцця. Я заўсёды памятала, што трэба ўзважваць кожнае слова, асабліва — у прысутнасці немцаў.

Марыя была сімпатычнай дзяўчынай, добра ведала польскую мову і тыдняў праз колькі стала заўважаць, што адзін з палякаў, Уладэк, нераўнадушны да яе: так і шукае магчымасці падысці, загаварыць, а то і праводзіць дадому.

— Я працавала кожны дзень да 12 гадзін ночы. Хадзіць дадому адной і сапраўды было страшнавата... Да таго ж Уладэк быў цікавым, вясёлым чалавекам, шмат расказваў пра сябе, сваё даваеннае жыццё...

Такім чынам я даведалася, што хлопец яшчэ ў Польшчы збіраўся пайсці ў партызаны, але не змог наладзіць сувязі, а потым яго прызвалі ў войска... Уладэк не хацеў ваяваць з Чырвонай Арміяй. Ён казаў, што такі ж настрой і ў астатніх яго таварышаў. Тады я асмялела і спытала: «Ці пайшоў бы ты цяпер у партызаны?» — «А як жа! — адказаў хлопец. — Іншыя таксама пойдуць». Пра гэта я паведаміла кіраўніцтву партызанскага атрада. Яно прызначыла дзень, і пераход адбыўся.

Былая партызанка Марыя СТРУК

знак з надпісам, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны тут дыслацыраваліся партызанскія атрады, а са студзеня 1944 года — брыгада С. П. Каплуна, дзе сярод непраходных балот пачыналіся партызанскія будні Марыі Струк.

— Немцы ўвесь час рабілі аблавы. Дзіўна, але перад кожнай з іх мне снілася мама, — успамінае Марыя Пятроўна. — Яна як бы папярэджвала мяне аб небяспецы. Самым памятным у гэтым плане стаў май 1943-га. Разведка данесла, што на 1 мая немцы плануюць чарговую аблаву. Я сказала Сцяпану Каплуну аб тым, што яе не будзе, бо мама не снілася, і аблавы сапраўды не было. Вечарам з'явілася новая дата — 2 мая. Я паведаміла, што хваляваць не варта. А раніцай 3 мая, прачнуўшыся, адразу пакіравала да камандзіра, сказала яму, што сёння аблава будзе, бо мама прысніла. Партызаны сталі пакідаць лагер. Аднак мне давялося вярнуцца, бо забылася свой пісталет. Выбегшы з зямлянкі, пачула шум і нямецкую мову. Сваіх даганяць было небяспечна — вырашыла схавацца ў кустах каля дарогі, перачакаць налёт. Бачыла, як немцы гаспадарылі ў лагеры, як з нарабаваным дабром пакіравалі назад. А неўзабаве пачуліся стрэлы і выбухі. Гэта нашы зрабілі засаду. Немцы яе не чакалі і пацярпелі паражэнне. 20 фрыцаў мы ўзялі ў палон. Пасля гэтага здарэння камандзір атрада кожны дзень цікавіўся, ці снілася мне мама.

...За некалькі месяцаў да вызвалення Маларытчыны Марыя Струк захварэла на тыф.

— Мяне пераправілі на паўспалены хутар Бераг, — гаворыць былая партызанка. — Там была і мая старэйшая сястра Вера, якая хавалася ад высылкі ў Германію. Неўзабаве мы разам вярнуліся дадому. І толькі тады я расказала маме, чаму пайшла кухарыць да немцаў, як апынулася ў партызанах.

...Восенню да дзяўчыны зноў вярнуўся тыф, і на гэты раз у яе выздараўленне ўжо ніхто не верыў. Аднак Марыя змагла-такі стаць на ногі, уладкавацца на працу, пражыць такое доўгае і цікавае жыццё.

Мікалай НАВУМЧЫК, фота аўтара.

Думаю так

НЯХАЙ ВОЛЬНА ЖЫВЕЦЦА ЎСІМ!

...У рэпертуары Анатоля Ярмолёнкі ёсць песня са словамі: «Розных людзей сустракаў у жыцці — добрых усё-такі болей». Што праўда — тое праўда.

Нейкі час у нашым пад'ездзе здымала кватэру сям'я азербайджанцаў: маці і два сыны-студэнты. Харошыя хлопцы, выхаваныя: заўжды віталіся пры сустрэчы, іншы раз нясеш што-небудзь цяжкае, — прапануюць сваю дапамогу.

Мая жонка была ў добрых адносінах з іх маці. Фарыда — яе так звалі — часам заходзіла да нас. Я сустракаў яе жартам: « Кто стучится в дверь моя? Это девушка пришёл». І мы ўсе разам смяяліся. А неяк на вуліцы я павіншаваў Фарыду з іх святам — Курбан-байрамам, дык потым яна зайшла да нас з кавалкам свайго нацыянальнага пірага.

Але ж у роду не без выроду. У суседстве з намі жыў вялікі аматар таннага віна. Дык ён, убачыўшы азербайджанцаў, заўсёды касавурыўся, шыпеў сваё: «Панаехали...» Не шкадаваў і эпітэтаў. І тым самым, як на мой погляд, ганьбіў народ Беларусі, які...

Даўней, па дарозе на работу, я ледзь не штодня сустракаў смуглявага мужчыну або такую ж жанчыну, якія ў дзіцячы садок адводзілі хлопчыка. Параўняўшыся, мы, незнаёмыя, ужо ўсміхаліся адзін аднаму, нават віталіся.

А неяк на галалёдзе я паслізнуўся, і той смуглявы першым працягнуў руку, дапамог падняцца... У той раз мы ўжо разгаварыліся, і я даведаўся, што яны з жонкай прыехалі з Емена, у нас вучыліся (не ў памяці цяпер, дзе канкрэтна), што ім тут многае падабаецца, і галоўнае — дабрыня мясцовых людзей.

...Не так даўно ў Гродне прайшоў трынаццаты фестываль нацыянальных культур. Я туды не трапіў, але ж, мяркуючы па тэлеверсіі гала-канцэрта, у Беларусі вольна жывецца розным народам. У грузін ёсць «Лезгінка», у яўрэяў — «Хава нагіла», у венграў — «Чардаш», у палякаў — «Краковяк», у рускіх — «Калінка», у нас — «Лявоніха»... Усё гэта — складнікі сусветнай культуры, якія толькі ўзбагачаюць яе.

...Не памятаю, хто сказаў, што патрыёт любіць сваё, а нацыяналіст ненавідзіць чужое. Так, мы павінны любіць, шанаваць, захоўваць сваю мову, культуру, традыцыі. І ў той жа час — з павагай ставіцца да быту, да здабыткаў іншых народаў. І калі б на нашай блакітнай планеце гэтым правілам кіраваліся ўсе, на Зямлі не было б ні войнаў, ні тэрактаў, а ўсе міжнародныя спрэчкі вырашаліся б выключна на канцэртных і спартыўных пляцоўках.

Мікалай СТАРЫХ,
г. Гомель.

Чалавек — чалавеку

«Не хапае людскіх нявест... Ды і жаніхоў»

...Як ні збліжалі мы горад з вёскай, а розніца, дзякаваць богу, паранейшаму ёсць! Ды яшчэ і якая! У горадзе што — адна мітусня. Людзі часам дзесяцігоддзямі жывуць на адной лесвічнай пляцоўцы, а ўсяго і стасункаў, што «дзень добры» і «вам не хварэць». Вяскоўцы іншыя: бліжэйшыя адзін да аднаго, больш адкрытыя, працавітыя, шчырыя. Там заўсёды і ўсё навідавоку. Як спяваецца: «Вёска чуе, вёска бачыць, вёска ведае ўсё: хто калі ў каго начуе, ад каго ў каго дзіцё».

Напрыклад, разгаварыліся мы неяк з суседкай пра сучасную моладзь. І не ўвогуле, у шырокім сэнсе, а на прыкладзе яе роднай унучкі. Тая вясной у водпуску была, за бацькоўскія грошы ў Турцыю злётала і, прыляцеўшы, нейкім чынам на выхадныя да бабулі трапіла, якраз на пасяўную. Людзі ў вёсцы куды ні глянь завіхаюцца: нехта гной вывозіць, нехта растрасае і бульбу садзіць, нехта грады разбівае, каб бурачкі ды моркву пасеяць... А гэта, адпускніца (бабуля сама расказвала), з вечара папярэдзіла, каб яе не будзілі. Ледзь не пад абед сама ўстала, у кашулі з хаты выпаўзла, пальчыкамі нос заткнула: «Фу-у, как здесь воня-я-ет!» — «Затое за сталом будзе пахнуць, — пераказвае размову суседка. — Давай, хуценька перакусі ды паможаш мне цыбулю садзіць, а то замуж выйдзеш і не будзеш ведаць, якім канцом у зямлю». — «Не буду і не трэба, — заяўляе ўнучка. — Я такога мужа знайду, каб усім забяспечваў, каб ніякіх там град». — «Уяўляеш, трыццаць гадоў дзявулі, а розуму — як у пятнаццаць. Усё халявы нейкай чакае, прынца на белым кані, каб назарабляў грошай, усё купіў, дом абставіў, а яе потым царстваваць прывёў ды яшчэ і прыслужваў: каву ў пасцель прыносіў, есці варыў, прыбіраў... Не скажу, адзін быў знайшоўся — гадоў пяць таму: пажыў з ёй, паслугаваў вось так ды хуценька знік... Мала цяпер дурных, мала ахвотных надзяваць на шыю хамут — нават прыгожы».

Унучка ў суседкі і сапраўды з твару сімпатычная. Але ж болей за ёй і сапраўды нічога: мамчына дачушка, а ўжо ж пястушка...

У часы нашай маладосці хлопцы ахвотней жаніліся на дзяўчатах з вёсак — працавітых, надзейных, верных. Ды і дзяўчатам смялей было замужам за вяскоўцамі.

Але ж дзе іх зараз узяць? Пусцеюць вёскі. Мала дзяцей і моладзі. Не хапае на ўсіх людскіх нявест ды і жаніхоў.

Н. САХАНЧУК,
Магілёўскі раён.

Усмешачку!

ЁСЦЬ РОЗНІЦА. ЦІ НЯМА?

...Цяпер вось, летам, як і многія вяскоўцы, я кожны дзень хаджу ў хлявок, дзе нясуцца куры, — забіраю свежыя яйкі. Днямі таксама зайшла, але ж без ніякай пасудзіны. Думала, можа, нічога і няма там...

А яечкі былі, тры штукі. Забрала, нясу ў руках. Насустрач — блізкая суседка.

— О-ой! Вы яйкі несяце, — кажа, павітаўшыся.

Я яе паправіла (хоць, можа, і не трэба было): сказала, што гэта куры нясуць — я проста забіраю.

Тамара АЛЯХНОВІЧ,
г. Слуцк.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Белдортранс», Минский р-н, п/о Озерцо, 28 км МКАД. УНП 690020891
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона
Адрес: **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 95-5, район аг. Озерцо**

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Изолированное помещение № 5	Производственное помещение	**194,9 кв. м**	600/D-123140

Начальная цена лота с НДС 20 % – 134 918,78 бел. руб. (снижена на 40 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единствен. участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах: торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое размещается на странице лота во вкладке «Документы». Страница лота содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 19.07.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов – 11.00 30.08.2022.** **Окончание торгов – 12.00 30.08.2022.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.08.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона

Предметы торгов

Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47718 (наименование: автогараж; назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), площадью 858,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 73/9, 0,15 км севернее д. Старое Село, автогараж, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000089, площадью 0,2573 га. **Обременение:** наличие действующего договора аренды.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Условия оплаты: согласно заключенному договору купли-продажи в течение 2 месяцев с даты заключения договора купли-продажи

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**126 000,00**	**Размер задатка, руб.**	**12 600,00**

Лот № 2: капитальное строение с инвентарным номером 100/U-89558 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Радваничский с/с, д. Малые Радваничи, ул. Молодежная, 6Б, на земельном участке с кадастровым номером 121283701101000574, площадью 0,2500 га.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Условия оплаты: согласно заключенному договору купли-продажи в течение 10 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Начальная цена, руб.	**14 500,00**	**Размер задатка, руб.**	**1 450,00**

Продавец: ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, тел. 80162918132. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона не позднее **14 сентября 2022 г. 17.00. Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 15 сентября 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, и иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 14 сентября 2022 г. до 17.00

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»
22 сентября 2022 года проводит 19-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
221	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131 № 03145 1981г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 435954 дв. 370663 1981 г. 3 кат. 1934 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	7 500,00	1 500,00
222	Автошасси ЗиЛ-131 ш. 760259 д. 789593 1987 г. 4 кат. 4587 км	н. п. Новоколосово, в/ч 25819	5 500,00	1 100,00
223	Автошасси ЗиЛ-131 ш. 493131 д. 667486 1982 г. 4 кат. 3140 км	н. п. Новоколосово, в/ч 25819	5 500,00	1 100,00
224	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131 № 02402 1983 г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 535277 дв. 883554 1983 г. 3 кат. 4526 км 12,5 м/ч	г. Осиповичи, в/ч 01313	7 700,00	1 540,00
225	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 060906 1981 г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 499204 дв. 698511 1982 г. 3 кат. 4045 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	7 700,00	1 540,00
226	Специальный автомобиль ЗиЛ-131Н с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 07658 1987 г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131Н ш. 754672 дв. 929335 1987 г. 3 кат. 1026 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	7 700,00	1 540,00
227	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К6-131 в составе: кузов-фургон К6-131 № 05611 1983 г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 542958 дв. 921150 1983 г. 3 кат. 2924 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	7 700,00	1 540,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 22 сентября 2022 г. в 10.00.
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 19 сентября 2022 г. Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 22 сентября 2022 г. с 9.15 до 10.00.
Победитель аукциона обязан:
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС. Справки по тел./факс: (017) 319-35-41, (017) 367-58-05. Электронная почта: auk@bsk.by.
Извещение опубликовано на сайте http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by.

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 23 сентября 2022 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже автотранспортного средства, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гомельстекло» на праве собственности

Лот № 1	**Грузовой седельный тягач MAZ 5440A8 360 030, рег. знак АЕ 0138-3,** год выпуска 2008. Цвет: бордовый. Номер кузова (рамы): Y3M5440A8900017790. Объем двигателя: 14,8 л. Вид топлива: дизель. Состояние: требует жестяных и покрасочных работ кузов. Все узлы и агрегаты в наличии, в рабочем состоянии. **Начальная цена лота: 13 400,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 1 300,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Местонахождение автотранспортных средств: Гомельская обл., г. Гомель, ул. М. Ломоносова, 25

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 21 сентября 2022 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **23 сентября 2022 г**. Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 25.08.2022 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 8 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 15 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47. сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by. Продавец: ОАО «Гомельстекло», г. Гомель, ул. Ломоносова, 25. тел.: +375 232 94-33-99; +375 29 757-24-07.

Информационное сообщение о проведении открытого аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков в д. Красный Берег Поплавского сельсовета Березинского района Минской области

Местонахождение объекта	Минская область, Березинский район, д. Красный Берег, ул. Светличная	Минская область, Березинский район, д. Красный Берег, ул. Светличная	Минская область, Березинский район, д. Красный Берег, ул. Светличная
Дата, время и место проведения аукциона	20 сентября 2022 года, в 11.00, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2, Поплавский сельисполком, зал заседаний		
Продавец и его адрес	Поплавский сельский исполнительный комитет, 223334, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, д. 2		
Кадастровый номер	620484305601000216	620484305601000217	620484305601000218
Площадь участка	0,1817	0,1817	0,1816
Вид права	Частная собственность	Частная собственность	Частная собственность
Условия продажи	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома)	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома)	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома)
Ограничения в использовании земельного участка	Охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона реки Березина вне прибрежной полосы	Охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона реки Березина вне прибрежной полосы	Охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона реки Березина вне прибрежной полосы
Наличие инженерных сетей	Отсутствие возможности подключения электроустановок граждан к электрическим сетям	Отсутствие возможности подключения электроустановок граждан к электрическим сетям	Отсутствие возможности подключения электроустановок граждан к электрическим сетям
Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона		
Затраты	2424,67 + публикация в СМИ	2424,67 + публикация в СМИ	2424,67 + публикация в СМИ
Начальная цена (руб.)	10000	10000	10000
Сумма задатка (руб.)	1000	1000	1000
Реквизиты продавца	Получатель – Поплавский сельисполком, р/с BY72AKBB36410602001776200000 в ЦБУ № 602 ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Борисов, БИК AKBBBY21612, УНП 600036561, ОКПО 4431843		
Условия аукциона	- продажа по цене не ниже начальной; - участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь; - при подаче заявления на определенный лот только одним участником земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %; - победитель аукциона возмещает расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона; - наличие не менее двух участников		
Окончательный срок приема документов	19 сентября 2022 года в 16.00		
Контактные телефоны	801715-63818, 63821		

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:
- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение задатка на счет продавца с отметкой банка;
- документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).
При подаче заявления заключается соглашение с сельисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

25 ЖНІЎНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15937)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Мікіта Бялько:

«Музыка — маё жыццё, я адчуў гэта дастаткова рана»

Ён — кумір соцень тысяч падлеткаў і моладзі, амбіцыйны хлопец і ўзыходзячая зорачка беларускай эстрады. Нягледзячы на юны ўзрост, у свае сямнаццаць юнак ужо паспеў прыняць удзел у папулярных тэлевізійных праектах і прэстыжных міжнародных конкурсах. Сёння Мікіта расказаў нам пра тое, як музыка становіцца часткай жыцця, ці лёгка працаваць у камандзе з зоркамі і якую галоўную параду ён хацеў бы даць нашым чытачам.

— Як музыка з'явілася ў тваім жыцці?

— Яна ўвайшла ў яго фактычна з самага нараджэння. Мая маці — музыкант, заканчвала кансерваторыю, калі я быў маленькі, працавала ў філармоніі. Таму яшчэ ва ўзросце двух-трох гадоў вельмі часта бываў на розных рэпетыцыях і ўліваўся ў артыстычнае жыццё. І ў гэты ж час у мяне пачалі праяўляцца здольнасці да музыкі.

Таму ў пяць гадоў пайшоў на вакал, а таксама пачаў вучыцца іграць на фартэпіяна.

Першапачаткова мама не моцна хацела, каб я быў музыкантам, таму што ведала, наколькі гэта складана. Але калі ў мяне з'явілася вялікае жаданне займацца гэтым — выбар стаў відавочны.

— Ці памятаеш сваё першае выступленне?

— Яно адбылося, калі мне было пяць гадоў. А ўжо ў шэсць быў першы тэлепраект у маім жыцці «Я спяваю». Выйшаў на сцэну Палаца Рэспублікі ў суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра, там мы выконвалі песні на розных мовах свету. Гэта быў каласальны досвед. І менавіта тады я ўпершыню адчуў, наколькі цудоўныя эмоцыі атрымліваеш, выступаючы перад такой колькасцю гледачоў. А мая сям'я на працягу ўсяго выступлення, як і на працягу ўсяго майго творчага шляху, мяне вельмі моцна падтрымлівала. Іх вера ў мяне вельмі дапамагае ў складаныя моманты.

— А калі зразумеў, што музыка — тваё прызванне?

— Дастаткова рана. У больш-менш усвядомленым узросце ўжо цвёрда разумеў, што гэта справа майго жыцця. І не было моманту, калі я думаў: нешта сумна мне зрабілася, а ці не заняцца чым-небудзь іншым?

Нядаўна ўсвядоміў, што самае галоўнае тое, што прымушае займацца і тварыць, — гэта сапраўдная любоў да музыкі, таму што яна — нейкая ўсёабдымная энергія, эмоцыя, стыхія, здольная змяняць жыццё людзей.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Даніна пашаны

ДАКРАНУЦЦА ДА «ЛІЧБАВАЙ ЗОРКІ»

На сайце праекта «Лічбавая зорка» ўкаранёны дадатковы модуль — асабісты кабінет карыстальніка. Цяпер наведвальнікі сайта змогуць самастойна дадаваць інфармацыю пра помнікі Беларусі, паведамілі ў ЦК БРСМ.

Фота з сайта БРСМ.

Нагадаем, што 22 чэрвеня Саюз моладзі прэзентаваў абноўленую версію сайта «Лічбавая зорка». Сёння ўкаранёны дадатковы модуль дазваляе карыстальнікам стаць датычнымі да захавання гістарычнай памяці і напаўняць раздзел «Помнікі» інфармацыяй аб помніках Беларусі часоў Другой сусветнай вайны і раздзел «Генацыд» — фактамі генацыду беларускага народа падчас Вялікай Айчыннай вайны, а таксама наносіць на карту такія месцы.

Любы карыстальнік можа прайсці рэгістрацыю і самастойна дадаваць помнікі на сайт. Рэгістрацыя зусім не складаная: указваюцца некаторыя даныя, у тым ліку аднымі з іх з'яўляюцца навучальная ўстанова і студэнцкі атрад, калі малады чалавек з'яўляецца яго байцом.

Уся інфармацыя будзе праходзіць мадэрацыю, паколькі патрабуе вывучэння, і толькі пасля таго — адлюстроўвацца на сайце. БРСМ такім чынам прыцягвае моладзь да работы з архівамі, да самастойнага вывучэння інфармацыі пра помнікі. На сёння алічбавана 1102 помнікі, такая работа працягваецца.

У Год гістарычнай памяці ў рамках патрыятычнага праекта Беларускіх студэнцкіх атрадаў «Іх імёнамі названы студэнцкія атрады» БРСМ выступіў нацыянальным аператарам далейшай рэалізацыі ініцыятывы Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі «Лічбавая зорка». Пры падтрымцы Беларускага тэлеграфнага агенцтва БРСМ да 22 чэрвеня быў завершаны рэдызайн сайта праекта «Лічбавая зорка».

Інтэрактыўны патрыятычны праект накіраваны на фарміраванне духоўна-маральных, грамадзянскіх якасцяў асобы, развіццё цікавасці і павагі да помнікаў баявой славы, якія ўвекавечылі трагічныя і гераічныя падзеі мінулага. Кожнаму знакаваму месцу прысвойваецца QR-код, праз які ажыццяўляецца пераход на старонку сайта праекта з інфармацыяй аб падзеях, што тут разгортваліся.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Будзь у тэме!

НЮАНСЫ ПРАЦАЎЛАДКАВАННЯ

Якія гарантыі і правы даюцца на першым працоўным месцы?

Каля 60 тысяч маладых спецыялістаў атрымалі сёлета першае месца работы. Большасць «навабранцаў» распачала работу па размеркаванні 1 жніўня, а 15 жніўня прыйшлі ў навучальныя ўстановы і маладыя педагогі. Нагадаем, што па заканадаўстве маладымі спецыялістамі ў Беларусі з'яўляюцца выпускнікі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія скончылі поўны курс навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў і былі накіраваныя на работу камісіяй па персанальным размеркаванні. Між іншым, цяпер і студэнты-платнікі, якія пажадалі размеркавацца, атрымліваюць тыя ж сацыяльныя гарантыі, прадугледжаныя для маладых спецыялістаў, што і выпускнікі бюджэтнай формы навучання.

Нявыкарыстаны водпуск не кампенсуецца

Не сакрэт, што многія выпускнікі ставяцца да размеркавання як да малапрыемнага абавязку. Хутчэй за ўсё, калі маладыя людзі імкнуцца паступіць на бюджэтную форму навучання, мала хто з іх задумваецца, што праз колькі гадоў за дыплом давядзецца расплачвацца сваёй сумленнай працай, прычым не там, дзе ты пажадаеш, а дзе дзяржаве спатрэбяцца твае веды і рукі. Перспектыва адправіцца ў глыбінку мала каго прываблівае... Тым не менш адмовіцца ад размеркавання і атрымаць свабодны дыплом можна толькі ў выключных выпадках. Уважлівай прычынай лічыцца паступленне на больш высокі ўзровень адукацыі, напрыклад, у магістратуру, або для выпускніка каледжа — на ўзровень вышэйшай адукацыі першай ступені. Таксама гэта служба ў войску, пытанні, звязаныя з непрацаздольнасцю і здароўем.

Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што знайсці работу і затрымацца на ёй наваспечаным маладым спецыялістам без прафесійнага досведу даволі складана. Правы выпускніку, якія пачалі работу па размеркаванні ў якасці маладых спецыялістаў, у нашай краіне абароненыя законам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

25 08 2022 г.

Кропка адліку

«Тэрмометр» для маладзёжнай палітыкі

Крытэрыі эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі дадуць магчымасць ацаніць становішча маладых людзей у Беларусі. Аб гэтым заявіла начальнік управлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Таццяна СІМАНОЎСКАЯ падчас круглага стала «Маладзёжная палітыка ў Беларусі: асноўныя напрамкі і прыярытэты».

«Для кіраўніцкіх рашэнняў і ўдасканалення работы нам не хапае сістэмы ацэньвання, нейкіх нормаў і крытэрыяў. Таму на працягу 2022 года Міністэрства адукацыі сумесна з міністэрствамі і ведамствамі, аблвыканкамамі распрацоўвала крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Цяпер праект знаходзіцца ўжо на завяршальным этапе. Гэта будзе абсалютна новы дакумент — у нас ніколі не было падобнага нарматыўнага акта. Плануецца яго зацвердзіць і зрабіць абавязковым, для таго каб, збіраючы інфармацыю, якая нас цікавіць, выкарыстоўваючы статыстычныя даныя і ведамасную справаздачнасць, мы маглі на працягу года атрымліваць дакладныя лічбавыя і колькасныя паказчыкі, зводзіць іх і рабіць ацэнку, пачынаючы ад установы адукацыі і заканчваючы любым дзяржорганам. У першую чаргу гэта дасць разуменне таго, што намі дасягнута, наколькі эфектыўна мы зрабілі сваю работу, чаго нам не хапае; дазволіць аб'ектыўна падыходзіць і да ацэнкі нашай работы, і наогул лепш бачыць становішча моладзі ў Беларусі, — растлумачыла Таццяна Сіманоўская. — Крытэрыі будуць ахопліваць практычна ўсе асноўныя напрамкі маладзёжнай палітыкі: ахову здароўя, культуру, пытанні занятасці, долю моладзі з другаснай занятасцю, уключанай у студатрадаўскі рух, і гэтак далей. Усе індыкатары і паказчыкі на гэты момант адпрацаваны і праходзяць апошнія ўзгадненні. Таксама мы працуем над сацыяльным пашпартам моладзі. Ён будзе дапаўненнем да нашых крытэрыяў».

Эксперт адзначыла, што ў Беларусі шмат робіцца для маладых людзей. «Рэгіянальныя семінары паказалі, што падыходы выбудаваны, сістэма працуе. Сфарміраваны вельмі моцны сацыяльны пакет, гэта датычыцца падтрымкі і маладых сем'яў, і маладых спецыялістаў», — падкрэсліла Таццяна Сіманоўская.

Акрамя таго, Міністэрствам адукацыі пашыраны нормы Закона «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі». «Праект закона знаходзіцца сёння ў Палаце прадстаўнікоў, ён падрыхтаваны да другога чытання. У законе мы ўлічылі навацыі і змяненні, унесеныя ў абноўлены Кодэкс аб адукацыі, які, у сваю чаргу, пацягнуў за сабой падрыхтоўку больш як 300 нарматыўных актаў па ўсіх напрамках сістэмы адукацыі. У праекце закона, у прыватнасці, прапісаны новы напрамак у нашай рабоце — гэта падтрымка маладзёжных ініцыятыў. У моладзі і маладзёжных арганізацый з'явіцца магчымасць вылучаць праекты, атрымліваць пад іх фінансаванне з боку дзяржавы і такім чынам уносіць уклад у развіццё свайго горада, рэгіёна і ўвогуле краіны», — праінфармавала прадстаўнік Мінадукацыі.

Паводле яе слоў, цяпер вядзецца работа над укараненнем яшчэ аднаго нарматыўнага акта — гэта Указ кіраўніка дзяржавы № 425. «Ён дазволіць атрымліваць у сферы маладзёжнай палітыкі да 20 грантаў з прэзідэнцкага фонду. Заклікаем моладзь адгукацца — ёсць гранты не толькі ў сферы адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя, але і ў маладзёжнай сферы. Любы малады чалавек або грамадскае аб'яднанне зможа атрымаць добрую фінансавую падтрымку на рэалізацыю свайго праекта», — запэўніла Таццяна Сіманоўская.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НЮАНСЫ ПРАЦАЎЛАДКАВАННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Заканадаўства прадугледжвае для іх шэраг дадатковых гарантый і кампенсацый, у іх ліку водпуск пасля заканчэння навучання, грашовая дапамога, кампенсацыя ў сувязі з пераездам на работу ў іншую мясцовасць і г. д., — тлумачыць **галоўны прававы інспектар працы Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.**

Пасля заканчэння навучання і перад пачаткам работы маладому спецыялісту належыць водпуск. Яго працягласць складае 31 каляндарны дзень. А будучым педработнікам належыць 45 каляндарных дзён адпачынку.

«Водпуск дае не наймальнік, а ўстанова адукацыі. Таму ў пасведчанні аб накіраванні на работу тэрмін прыбыцця маладога спецыяліста да наймальніка ўказваецца ўжо з улікам дзён адпачынку. Такім чынам, малады спецыяліст самастойна выкарыстоўвае сваё права на водпуск, — падкрэслівае Ларыса Манюк. — Але ён мае права выкарыстоўваць не ўсе дні. Таксама ён можа адмовіцца ад дадзенай гарантыі. Адпаведна, малады спецыяліст можа прыбыць для працаўладкавання раней за ўказаны ў пасведчанні тэрмін. Наймальнік адразу павінен растлумачыць, што калі малады чалавек не скарыстаецца правам на водпуск або выкарыстае не ўсе яго дні (напрыклад, 20 замест 31), пазней патрабаваць, каб яму прадаставілі астатнія дні водпуску, ён ужо не зможа. Звярніце ўвагу: выплачваць маладому спецыялісту кампенсацыю за нявыкарыстаныя дні водпуску наймальнік не павінен. Таму калі вы самі вырашылі распачаць работу раней, ніякіх фінансавых прэтэнзій да наймальніка прад'явіць не зможаце...»

Пад'ёмныя і кампенсацыя за пераезд

У месячны тэрмін з дня заключэння працоўнага дагавора наймальнік павінен выплаціць маладому спецыялісту грашовую дапамогу, так званыя пад'ёмныя. Яе выплата ажыццяўляецца на падставе загада наймальніка. Памер залежыць ад атрыманай маладым спецыялістам адукацыі і ад таго, ці выплачвалася яму стыпендыя ў апошнім перад выпускам семестры (паўгоддзі). Калі яна не выплачвалася, то памер пад'ёмных устанаўліваецца з разліку сацыяльнай стыпендыі, якая была актуальная на дату выпуску.

«Калі малады спецыяліст размеркаваны да наймальніка, з якім ён ужо знаходзіцца ў працоўных адносінах, яму таксама выплачваецца грашовая дапамога. Ніякіх выключэнняў на гэты конт у заканадаўстве няма, — тлумачыць прававы інспектар працы. — Памер стыпендыі, у тым ліку сацыяльнай, можна даведацца з даведкі аб памеры стыпендыі. Яна выдаецца ўстановай адукацыі разам з дыпломам. Хачу заўважыць, што выплата грашовай дапамогі і яе памер не залежаць ад таго, колькі дзён адпачынку выкарыстаў малады спецыяліст і ці выкарыстаў наогул. Маладому спецыялісту, накіраванаму для работы ў якасці педработніка, грашовая дапамога выплачваецца за 45 каляндарных дзён».

Кампенсацыя ў сувязі з пераездам на работу ў іншую мясцовасць таксама адносіцца да абавязковых выплат. Калі першае працоўнае месца, куды накіраваны па размеркаванні малады спецыяліст, размешчана ў населеным пункце, які не з'яўляецца месцам жыхарства выпускніка, і прадугледжвае пераезд у іншы горад, то малады спецыяліст можа разлічваць на яе атрыманне.

— Напрыклад, малады спецыяліст пастаянна зарэгістраваны па месцы жыхарства ў Магілёве. На час навучання ён быў часова зарэгістраваны па месцы знаходжання ў Мінску, а размеркавалі яго ў арганізацыю, размешчаную ў сталіцы. У гэтым выпадку яго пастаяннае месца жыхарства (Магілёў) не супадае з месцам працы. Такім чынам, яму павінна быць выплачана кампенсацыя, — тлумачыць Ларыса Манюк. — Калі малады чалавек навучаўся ў Мінску, яго пастаяннае месца жыхарства — Магілёў, а ён быў размеркаваны ў Гомель, яму таксама належыць выплата кампенсацыі для пераезду ў іншы населены пункт. Калі ж малады спецыяліст навучаўся ў сталіцы, а яго пастаяннае месца жыхарства — Магілёў, і размеркаваны ён быў у гэты абласны цэнтр, то пастаяннае месца жыхарства і месца працы маладога спецыяліста супадаюць. Прэтэндаваць на кампенсацыю ён не зможа. Месца жыхарства работніка пацвярджаецца адзнакай аб рэгістрацыі ў пашпарце.

Наймальнік пакрывае маладому спецыялісту наступныя выдаткі і робіць наступныя выплаты, звязаныя з яго пераездам: сродкі, затрачаныя на аплату праезду маладога спецыяліста і членаў яго сям'і (мужа, жонкі, дзяцей і бацькоў абаіх мужа і жонкі, якія знаходзяцца на іх утрыманні і пражываюць разам з імі) на тых жа ўмовах, што і пры накіраванні работніка ў службовую камандзіроўку; выдаткі на правоз чыгуначным, водным і аўтамабільным транспартам (агульнага карыстання) маёмасці, пры гэтым норма складае да 500 кілаграмаў — на маладога спецыяліста і да 150 кілаграмаў — на кожнага члена сям'і, які пераязджае (калі дасягнута пагадненне з наймальнікам, то могуць аплаціць выдаткі па перамяшчэнні большай вагі маёмасці); сутачныя за кожны дзень знаходжання ў дарозе, у адпаведнасці з заканадаўствам аб службовых камандзіроўках.

Таксама малады спецыяліст атрымлівае аднаразовую дапамогу. Яе памер складае месячную тарыфную стаўку (аклад) па новым месцы работы на маладога спецыяліста, а на кожнага члена сям'і, які пераязджае з ім, — па адной чацвёртай дапамогі на самога выпускніка.

«Тэрмін выплаты кампенсацый на пераезд заканадаўства не ўстанаўлівае. Мяркую, выплаціць іх можна разам з першым заробкам маладога спецыяліста. Але пры ўмове, што той прадставіў наймальніку ўсе дакументы, якія пацвярджаюць панесеныя выдаткі, гэта значыць білеты на праезд, квітанцыі на аплату правозу багажу і г. д.», — дадала Ларыса Манюк.

Чаму трэба зазірнуць у калектыўны дагавор?

А вось **абавязак забяспечваць маладога спецыяліста жыллём нідзе на заканадаўчым узроўні не прапісаны**. Адзіная гарантыя ў гэтай сферы, замацаваная на дзяржаўным узроўні, — права маладога спецыяліста, які прыбыў па месцы размеркавання, прымацца на ўлік асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без дадатковых патрабаванняў па неабходным тэрміне пражывання ў адпаведным населеным пункце, у тым ліку ў Мінску і Мінскім раёне.

— Натуральна, на месцах усе разумеюць, што без жылля замацаваць кадры, асабліва ў сельскай мясцовасці, немагчыма, таму шукаюць месцы ў інтэрнатах, даюць службовае жыллё, дапамагаюць будаваць сваё, — кажа Ларыса Манюк. — Наймальнік у індывідуальным парадку разглядае пытанне аб вызначэнні памеру выплат на арэнду жылля, парадку і ўмовах кампенсацыі.

Прававы інспектар працы раіць: першае, што павінен зрабіць малады педагог, які прыбыў на месца размеркавання, — гэта схадзіць у прафкам, дзе яму растлумачаць яго правы. І абавязкова трэба азнаёміцца з калектыўным дагаворам, бо там ёсць важныя пункты, якія датычацца гарантый маладым спецыялістам, у тым ліку і па кампенсацыі арэнды жылля. Трэба азнаёміцца і са службовай інструкцыяй. У сістэме адукацыі ў маладых спецыялістаў ёсць выбар: заключыць кантракт або бестэрміновы працоўны дагавор. Звычайна ўсе выбіраюць кантракт, бо па ім прадугледжваецца павышэнне тарыфнай стаўкі (аклада) плюс даюцца дадатковыя дні адпачынку.

Як ставіцца да размеркавання, кожны вырашае для сябе сам. Але відавочныя плюсы ў яго таксама ёсць. Размеркаванне не проста гарантуе выпускніку, які яшчэ не мае практычнага досведу, першае працоўнае месца. Малады спецыяліст у гэтым выпадку падстрахаваны з усіх бакоў. Па-першае, наймальнік абавязаны даць яму работу па той спецыяльнасці і той кваліфікацыі, якая ўказана ў яго дыпломе і занатавана ў накіраванні. Але самая галоўная прывілея — абарона ад звальнення на працягу двух гадоў. Наймальнік не мае права ўстанаўліваць маладым спецыялістам выпрабавальны тэрмін і не можа звольніць маладога спецыяліста на аснове такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць займаемай пасадзе ці выконваемай рабоце з прычыны недастатковай кваліфікацыі».

«Рашэнне маладога спецыяліста застацца і далей працаваць па месцы размеркавання пасля двухгадовага тэрміну залежыць выключна ад зацікаўленасці наймальніка і ад створаных для яго умоў, — падкрэслівае Ларыса Манюк. — Напрыклад, у Мінскай вобласці на працягу апошніх трох гадоў на першым рабочым месцы застаецца больш за 90 працэнтаў маладых педагогаў. Аднак ёсць і іншыя назіранні: на жаль, не ўсе наймальнікі зацікаўленыя ў замацаванні маладых спецыялістаў. Нярэдка маладыя людзі звальняюцца, паколькі не бачаць перспектыў сваёй далейшай работы ў канкрэтнай арганізацыі. Наймальнік таксама не бачыць у гэтым асаблівай праблемы, паколькі штогод па размеркаванні на месца выбылых ён зноў набірае маладых спецыялістаў».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Трэці працоўны

СТУДАТРАД: ШЛЯХ, ЯКІ ВАРТА ПРАЙСЦІ КОЖНАМУ

35 студэнцкіх атрадаў былі створаны ў БДУ гэтым летам. Працоўны семестр працягнецца да пачатку верасня. Арганізатарам акцыі выступае Штаб працоўных спраў БРСМ навучальнай установы.

Другакурсніца факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Лізавета ВАРАБ'ЁВА была камандзірам вытворчага атрада на прадпрыемстве «Атлант». «Ва ўсіх удзельнікаў розныя абавязкі і аперацыі — ад закручвання самарэзаў пнеўмапісталетам да праверкі на ўцечку халадзільнікаў. Мой участак называўся «Падрыхтоўка апоры тэрмарэгулятара», я працавала з гэтымі апорамі, разбірала накрыўкі, прыкручвала праводку, устаўляла святлодыёдныя модулі з плафонамі», — расказвае Лізавета. Гэта ўжо другі досвед работы дзяўчыны ў студатрадзе, у чэрвені яна была камандзірам сэрвіснага атрада ад БРСМ Фрунзенскага раёна. Пасля работы засталося мноства станоўчых эмоцый, прыемных знаёмстваў, а таксама цікавыя гісторыі і ўспаміны...

Трэцякурснік факультэта журналістыкі Кірыл ДЗМІТРУК таксама вырашыў знайсці альтэрнатыву пасіўнаму адпачынку на летні перыяд. Хлопец пайшоў працаваць у будаўнічы студэнцкі атрад па добраўпарадкаванні і рамонце. Ён шчыраваў у інтэрнаце № 4 БДУ. «Мы клеілі шпалеры, фарбавалі лаўкі, урны, сцены, прыбіралі смецце, шпаклявалі. Занятасць была пяць дзён у тыдзень, поўны рабочы дзень», — расказаў студэнт. Удзельнікам студатрада Кірыл стаў упершыню. За гэты час ён атрымаў новыя навыкі, якія абавязкова спатрэбяцца яму ў далейшым.

Выхавальнікам у дзіцячым аздараўленчым лагеры «Галактыка» працавала **трэцякурсніца філалагічнага факультэта Вікторыя ЯКІМЧЫК**. Студэнтка сачыла за станам здароўя дзяцей, іх паводзінамі, арганізоўвала вольны час і атрадныя мерапрыемствы. «Рабочы дзень у мяне пачынаўся з васьмі раніцы і заканчваўся пасля 22.00, былі і начныя дзяжурствы, пасля якіх звычайна даюць адаспацца», — падзялілася Вікторыя.

Будатрад «Праваднік» імя Героя Савецкага Саюза Ціхана Бумажкова.

У педагагічны атрад дзяўчына трапіла ўпершыню, але выбарам напрамку засталася задаволеная. «Мне вельмі спадабалася працаваць выхавацелем. Таксама пашанцавала і з дружным калектывам. Планую налета зноў трапіць у студатрад», — падкрэсліла Вікторыя.

Гэтым летам частка студэнцкіх атрадаў Мінска была накіравана на дапамогу будаўнікам, якія ўзводзяць аб'екты Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. Сярод байцоў — студэнты БДУІР. У жніўні работу распачала новая каманда з 11 хлопцаў — атрад «Праваднік» імя Героя Савецкага Саюза Ціхана Бумажкова. Для некаторых байцоў гэта ўжо другая працоўная змена: на будоўлі яны працуюць з чэрвеня.

Аляксандр МАНЬКО перайшоў на другі курс факультэта камп'ютарных сістэм і сетак. Лета ў студатрадзе студэнт праводзіць упершыню.

«Я чуў пра студатрадаўскі рух ад сяброў. Даведаўся пра магчымасць запісацца на работу з сацсетак БДУІР. Параіўся са знаёмымі і вырашыў пайсці ў будаўнічы атрад. Для студэнтаў гэта магчымасць атрымаць неацэнны досвед, пазнаёміцца з рознымі людзьмі і, вядома, зарабіць», — паведаміў хлопец.

Лізавета Вараб'ёва.

Рабочы дзень у атрадзе пачынаецца а восьмай раніцы з планавання спраў. Па словах байцоў, у апошні час асноўнай работай была чыставая прыборка жылых пакояў, падбор ключоў і сістэматызацыя нумароў па блоках. Але і будаўнікамі студэнты сябе адчулі ў поўнай ступені: яны дапамагалі мулярам, страхарам, сталярам і электрыкам.

«На рабоце мы кантактуем з будаўнікамі і пераймаем іх досвед у розных справах. Часта ўзнікаюць складаныя сітуацыі, у якіх даводзіцца нестандартна думаць. Гэта выпрацоўвае новыя навыкі і адказнасць. Ва ўніверсітэце ўсё значна прасцей, — усміхаецца Аляксандр. — Я ўпэўнены, што атрымаў вельмі каштоўны досвед. Калі ты быў задзейнічаны ў будаўніцтве, па-першае, можаш зрабіць многія рэчы сам, па-другое, разумееш, ці якасна выкананы рамонт, бачыш скрытыя праблемы і недахопы».

Хлопцы працуюць на важным дзяржаўным аб'екце. «Лічу, што кожны павінен зрабіць унёсак у развіццё нашага прыгожага Мінска, бо гэта горад магчымасцяў. Вялікае пачынаецца з малога. Мяркую, гэтая думка як ніколі падыходзіць да таго, што мы робім», — падкрэслівае Аляксандр Манько.

Баец студатрада Раман БАГДАНАЎ падтрымлівае калегу і сябра ў згаданым пытанні. «Гэта мой першы вопыт работы ў атрадзе. Абраў будаўнічы, таму што на першы погляд ён падаўся найбольш прывабным. І я ні кроплі не пашкадаваў, што сюды трапіў, — канстатуе Раман. — Адносіны ў калектыве склаліся добрыя, падчас перапынкаў пастаянна жартуем. Некаторыя хлопцы вельмі матывуюць сваёй адданасцю справе. У нас шмат рознай работы. Адпампоўваем ваду ў падвале, дапамагаем страхарам, якія ўкладваюць шклавату на даху, загружаем-разгружаем матэрыялы і мэблю».

Выхаванне адказнасці, цікавыя знаёмствы, добры калектыў, карысны вопыт — вось асноўныя плюсы студатрадаўскага руху, якія адзначаюць для сябе работы. Яны лічаць, што работа ў студатрадзе — шлях, які адназначна варта прайсці.

Па матэрыялах прэс-службаў БДУ і БДУІР падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Новы досвед

Фізіка «на пальцах»

Студэнты БДУ запусцілі праект па эксперыментальнай фізіцы для школьнікаў. Яго мэта — папулярызацыя ведаў аб прыродазнаўчых навуках і прыцягненне дзяцей і падлеткаў да навукова-даследчай дзейнасці.

Так, у рамках ініцыятывы для навучэнцаў 5-8 класаў сталічных і рэгіянальных школ і гімназій арганізоўваюцца серыі адукацыйных заняткаў па розных тэматычных раздзелах фізікі. Слухачам расказваюць аб фізічных з'явах, знакамітых вучоных і дэманструюць эксперыменты. Удзельнікамі мерапрыемстваў ужо сталі школьнікі з Мінска, Барысава, Жодзіна, Ліды і іншых гарадоў Беларусі.

Таксама з нядаўняга часу праектная каманда пачала запісваць відэа з навуковымі даследамі і тлумачэннямі да іх. Ролікі можна паглядзець на YouTube-канале (https://www.youtube.com/channel/UCnJcLDPa8bpm8Ie_RQENicA).

Па словах **кіраўніка праекта, трэцякурсніцы фізічнага факультэта Кацярыны ЕРМАКОВАЙ**, эксперыментальная фізіка можа быць цікавай не толькі школьнікам. «Мы плануем пашырыць праект і падрыхтаваць серыю лекцый і эксперыментаў для студэнтаў іншых факультэтаў БДУ», — падзялілася яна. Таксама ў планах арганізатараў — удасканаліць методыкі работы з аўдыторыяй і ўкараніць сучасныя інтэрактыўныя адукацыйныя тэхналогіі. Акрамя таго, юнакі і дзяўчаты рыхтуюцца выступіць на Дні адкрытых дзвярэй факультэта і ўзяць удзел у наступным Фестывалі навукі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Камертон настрою

СЯБРОЎСТВА, ЗМАЦАВАНАЕ ПЕСНЯЙ

Па ініцыятыве Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі з 14 да 19 верасня на тэрыторыі Смаленскай вобласці адбудзецца XV Фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву». Гэта маштабны творчы і адукацыйны форум, накіраваны на стварэнне адзінай культурнай прасторы Саюзнай дзяржавы, умацаванне дружбы моладзі Расіі і Беларусі, прапаганду найлепшых ідэй у галіне сучаснага моладзёжнага руху і наладжванне супрацоўніцтва паміж моладзёжнымі аб'яднаннямі дзвюх краін, а таксама выяўленне і падтрымку таленавітай моладзі.

Мінулы, XIV Фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», прайшоў у 2019 годзе ў Растове-на-Доне. У сувязі са змякчэннем дзеючых каранавірусных абмежаванняў дэпутаты Парламенцкага сходу прынялі рашэнне аднавіць у 2022 годзе правядзенне маштабнага маладзёжнага форуму. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі фарміруе склад дэлегацыі ад нашай краіны і забяспечвае яе ўдзел у XV Фестывалі «Моладзь — за Саюзную дзяржаву».

У яго мерапрыемствах возьмуць удзел дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, дзяржаўныя, грамадскія і палітычныя дзеячы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый рэгіёнаў Беларусі і Расіі, маладзёжныя мастацкія калектывы, студэнты, удзельнікі і пераможцы маладзёжных конкурсных мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы, вядомыя артысты і дзеячы культуры, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі з абедзвюх краін. Агульная колькасць удзельнікаў фестывалю — каля 300 чалавек, а разам з гледачамі і гасцямі дасягае 15 тысяч.

Праграма форуму абяцае быць насычанай і цікавай. На працягу фестывальнага тыдня пройдуць урачыстае адкрыццё і закрыццё мерапрыемства, выязныя канцэрты ў гарады Смаленскай вобласці, тэматычныя праграмы для ўдзельнікаў фестывалю, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, студэнтамі ВНУ, вечары дружбы моладзі Беларусі і Расіі і іншае.

Яркай падзеяй фестывалю стане конкурс выканаўцаў маладзёжнай песні, у якім возьмуць удзел маладыя людзі ва ўзросце ад 16 да 25 гадоў: салісты, аўтары-выканаўцы, дуэты, ансамблі. Па ўмовах конкурсу ўдзел у ім бярэ не больш за два суіскальнікі ад аднаго горада ці вобласці. Усяго для ўдзелу ў конкурсе дапускаецца не больш як 20 канкурсантаў: ад Расіі — да 12 чалавек, ад Беларусі — да 8.

Паводле інфармацыі мастацкага кіраўніка — каардынатара ўдзельнікаў фестывалю ад Беларусі Аляксандра Далжэўскага, у адрас аргкамітэта па фарміраванні беларускай дэлегацыі паступілі творчыя заяўкі на ўдзел у конкурсе з усіх абласцей і Мінска. Адборачны тур конкурсу адбыўся ў Маладзёжным тэатры эстрады пры падтрымцы Міністэрства культуры.

Фота з сайта БРСМ.

Кожнаму ўдзельніку адборачнага тура трэба было прадставіць дзве песні, адна з якіх павінна раскрываць тэмы любові да Радзімы, роднага краю, подзвігу народа, а другая — адлюстроўваць сучасныя маладзёжныя тэндэнцыі. Песні неабходна было выконваць на рускай ці беларускай мове, у якасці выключэння дазвалялася выкананне адной з песень на нацыянальнай мове выканаўца. Па ўмовах конкурсу ўсе выступленні праходзілі пад фанаграму «мінус адзін», якая магла ўключаць у сябе бэк-вакал, або ў «жывым» суправаджэнні не больш за пяць выканаўцаў (гітара, фартэпіяна, скрыпка і г. д.).

Ацэньвала вакальныя даныя і выканальніцкае майстэрства ўдзельнікаў прафесійнае журы, члены якога вызначылі склад удзельнікаў, што будуць прадстаўляць нашу краіну ў Смаленску. Усяго ў барацьбе за такую пуцёўку бралі ўдзел 17 канкурсантаў, у выніку былі адабраны восем з іх.

Сяргей РАСОЛЬКА.

SEX-БАЛЯСЫ

ПОКЛІЧ ДЖУНГЛЯЎ

Чалавек памылкова лічыць сябе вянцом прыроды. Часта гэтая самаўпэўненасць прыводзіць да камічных або трагічных наступстваў. Упэўнены ў сваёй непахіснай праваце ва ўсім, ён «перагінае палку», спрабуючы весці рэй, падпарадкоўваць сабе нават жывёльны свет. («Чалавек створаны для шчасця, як птушка для палёту», любяць здзекавацца з людзей пінгвіны і страусы») Гэткі адмысловы покліч джунгляў... («— Мудры Каа, растлумач, што са мной? Мне хочацца бегчы, задыхаючыся, далёка-далёка ў джунглі! Мяне перапаўняюць пачуцці, маё сэрца ўвесь час шалёна б'ецца! Гэта каханне?» — «Не, Маўглі, гэта чарговы прыступ у войска».)

На ферме ў французанкі Дамінікі Дутэ жыве каля 60 качак. Птушкі плёскаюцца ў невялікім вадаёме, шпацыруюць у яго навакольлі і, зразумела, шмат кракаюць. («У рэстаране жанчына пытаецца ў афіцыянта: «У вас качка дзікая?» — «Не, але для вас мы можам разславаць хатнюю».) Гэта не спадабалася суседзям — яны падалі на жанчыну ў суд і запатрабавалі 3,5 тысячы еўра кампенсацыі. А заадно папрасілі... суцішыць качак. («Фразай «Гусь свінні не таварыш» індык справакаваў бойку хлеў на хлеў».) Аднак суд стаў на бок птушак — гучнасць кракання аказалася ў межах нормы. Проста суседзі нядаўна пераехалі з горада і, мяркуючы па ўсім, пакуль не прывыклі да гукаў сельскага жыцця. Дутэ была шчаслівая, бо перажывала, што ёй давядзецца пазбавіцца любімых гадаванцаў. «Качкі перамаглі», — пажартавала француженка. («Індык думаў, што купаецца, пакуль вада не закіпела».)

Пажылы мужчына выпадкова ўзарваў свой дом у Францыі, спрабуючы забіць муху. 80-гадовы пенсіянер збіраўся паабедаць, калі пачуў гудзенне кузуркі. Тады ён паспрабаваў забіць муху электрычнай мухалапкай, але ў яго доме працякаў газавы балон. З-за іскры прылады адбыўся выбух. У выніку надзвычайнага здарэння разбурыліся кухня і частка даху. Мужчыну ж даставілі ў шпіталь з апёкам рукі. («Чаму гэтыя мухі лётаюць толькі вакол мяне?» — «А ты сам здагадайся...» — «Я — варэнне?» — «Ды ты аптыміст...»)

Немцам перашкаджаюць спаць вожыкі, якія спароўваюцца. У нямецкую паліцыю і службы выратавання па ўсёй краіне ўсё часцей паступаюць званкі з-за страшнаватых начных крыкаў і шуму. Нацыянальная праблема нават атрымала свой хэштэг #igelsex, што перакладаецца як «секс вожыкаў». («Вожык — самая разумная жывёліна. Яму ўсё зразумела».) Спецыялісты адзначылі, што вожыкі гадзінамі могуць шыпець, скуголіць і нават крычаць падчас сваіх шлюбных рытуалаў. («Слабы чалавек падчас сексу стогне, а моцны — трывае».) Сезон спароўвання гэтых жывёл доўжыцца з красавіка да пачатку верасня. Эксперты-ветэрынары дадалі, што больш за ўсё шуму выходзіць ад самцоў, і парэкамендавалі не турбаваць звяроў. («У кожнага паважаючага сябе вожыка ў норцы абавязкова ёсць фотаальбом са здымкамі «пятых кропак», якімі яго палохалі».)

Кадр з мультфільма «Маўглі».

«Фэйсбук» двойчы заблакіраваў трансляцыю з савінага гнязда. Алгарытмы вырашылі, што гэта занадта сексуальна. Жыхар англійскага горада Данкастэр Грэм Мос запусціў з яго прамую трансляцыю. А потым выявіў, што стрым заблакіравалі. Прычына — парушэнне правілаў супольнасці, а менавіта — публікацыя кантэнту, які змяшчае «агаленне і дзеянні сексуальнага характару». («Хатняя жывёліна павінна быць цікай, спакойнай і не прыносіць клопату гаспадару. Вось, напрыклад, чучала савы...») Тады Мос яшчэ раз вылажыў трансляцыю ў «Фэйсбук», за што атрымаў бан на 24 гадзіны. Прычына ўсё тая ж — публікацыя «даруслага» кантэнту. («Звычайная ноч. Муж і жонка ў ложку не могуць заснуць: за сценкай надрываецца суседскае дзіця. Яна: «Ты ўсё яшчэ хочаш завесці дзіця?» Ён: «Дык трэба ж неяк адпомсціць!») На сітуацыю з савіным гняздом звярнулі ўвагу брытанскія выданні. У рэшце рэшт прадстаўнікі «Фэйсбука» разблакіравалі стрым і папрасілі прабачэння перад Мосам за дастаўленыя нязручнасці. Цяпер карыстальнікі сацсетак могуць глядзець на соў, не баючыся блакіравання. («Ужо калі я закахаўся ў дзяўчыну, дык гэта на ўсю ноч. А тое і да раніцы».)

Але няправільна было б думаць, што чалавек можа толькі браць нешта ад прыроды. Нават беручы, людзі здольныя і аддаваць («Бачыў дзяўчыну з прадуктамі каля дамафона. Яна набрала нумар і кажа: «Раз, раз. Ястраб прынёс здабычу. Як чуваць? Прыём!» Думаю, у сям'і ў іх не сумна...») Так, у ЗША адкрылася вакансія абдымальніка парасят. Амерыканскі прытулак у штаце Паўднёвая Караліна адкрыў вакансію для валанцёраў, якія будуць дапамагаць жывёлам у «сацыялізацыі». («— Мы ў адказе за тых, каго прыручылі!» — «Вам лёгка — у вас папугай, а ў мяне галодны муж, дзеці».) У абавязкі работніка будуць уваходзіць абдыманне з жывёлінамі, чуханне, а таксама кармленне печывам. Уладальнікі прытулку лічаць, што гэта дапаможа парасятам прызвычаіцца да людзей і падрыхтавацца да новых гаспадароў. («Людзі былі створаны для таго, каб катам было з кім жыць».) Уладальнікі прытулку адзначылі, што калі карыстальнікі сацсетак жадаюць дапамагчы гадаванцам, але не маюць магчымасці быць абдымальнікамі для парасят, яны могуць зрабіць ахвяраванні або набыць нешта для жывёл. («Дзяўчына, якая не ведае, як ужо намякнуць хлопцу на футра, прыкладвае да сябе ката і пытаецца: «Ну як мне?»)

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Музыка — маё жыццё, я адчуў гэта дастаткова рана»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Як вырашыў паўдзельнічаць у шоу «Голас дзеці 5»?

— Туды я трапіў спантанна. Мая бабуля ўбачыла ў інтэрнэце, што да заканчэння падачы заявак на «Голас дзеці 5» застаўся адзін дзень. Мы вырашылі паспрабаваць, асабліва нічога не чакаючы. Але неўзабаве нас запрасілі ў Маскву, і гэта быў цікавы перыяд майго жыцця. Практычна першы раз я пабываў у такім вялікім горадзе. На слыхах праслухоўваннях да мяне павярнуліся Баста і Валерый Меладзэ. Я абраў другога, бо Басту і яго творчасць у тым узросце яшчэ амаль не ведаў. На праекце мы таксама працавалі і з Канстанцінам Меладзэ. Было цікава ўпершыню пасупрацоўнічаць са знакамітымі людзьмі і зразумець, што яны такія ж, як і мы. Першы досвед на такім маштабным праекце прайшоў удала. У тройках мы зрабілі вельмі яркі нумар з песняй «Cryin» гурта Aerosmith.

— Калі даведаўся, што ў Беларусі адкрываецца сваё музычнае тэлевізійнае шоу, ці адразу вырашыў паўдзельнічаць?

— Калі толькі анансавалі «Х-фактар», для нашай краіны гэта была сапраўды грандыёзная падзея. Але ў той момант я не падыходзіў па ўзросце, і тады ў мяне яшчэ актыўна праходзіла ломка голасу. На жаль, пачалася пандэмія, і праект прыйшлося перанесці. Даведаўся аб тым, што тэлевізійнае шоу зноў аднаўляецца, зусім выпадкова. На адным канцэрце размаўлялі з Андрэем Коласавым, ён мне і паведаміў гэтую навіну, параіў не упускаць магчымасць. Я рашыўся! І зусім не дарэмна.

— Раскажы пра свае ўражанні ад удзелу ў шоу...

— У «Х-фактару» вельмі цікавы фармат. На праекце правяраюцца не толькі твае вакальныя і артыстычныя даныя, але і характар, стойкасць, уменне трымаць сябе падчас стрэсавых сітуацый. Наогул, я лічу, што гэтае шоу вельмі моцна загартавала мяне. Я рады, што ўдалося прабіцца праз чатыры тысячы прэтэндэнтаў, трапіць у трэніровачны лагер, а затым у каманду Вольгі Бузавай. Разам мы прайшлі доўгі шлях на праекце і дабіліся добрых вынікаў.

— Ці складана было працаваць з такой «зорнай» настаўніцай?

— Мне было прыемна пазнаёміцца з Вольгай Ігараўнай Бузавай. Яна адразу пачала праяўляць клопат аб сваіх удзельніках, змагалася за нас, сваю каманду, да канца ў любых сітуацыях. Яшчэ мяне ўражвала яе шчырасць. Якая яна была на камеры ў эфіры, такой жа і за кулісамі пры асабістых стасунках, а гэта каштоўная і рэдкая якасць у людзях. А яшчэ падкупляла яе непадробная цікавасць да гэтага шоу.

— З якімі цяжкасцямі прыйшлося сутыкнуцца?

— Самым складаным і ў той жа момант самым цікавым былі прамыя эфіры. Нервы абвостраныя да мяжы, велізарны ціск як з боку настаўнікаў, так і з боку гледачоў, якія дасылалі сотні паведамленняў падчас шоу кожны дзень. За час праекта былі частыя перапады настрою, бо за тыдзень трэба было вывучыць новую песню, паставіць нумар, а ў апошніх эфірах — два нумары за тыдзень. І ў пэўны момант падавалася, што часу не хопіць, што нічога не атрымаецца. Але я не зламаўся і даказаў сабе і ўсім, на што здольны.

— А што было самым запамінальным?

— Незабыўнымі былі выхады на сцэну ў прамым эфіры, асабліва першы эфір пасля дастаткова доўгага перапынку на вялікай сцэне. Пасля выступлення не мог стрымаць эмоцый — настолькі гэта былі неверагодныя энергія і шчасце ад працэсу.

— Як змянілася тваё жыццё пасля «Х-фактару»?

— Пасля праекта я актыўна займаюся творчасцю і, спадзяюся, лета атрымалася вельмі прадукцыйным. Выпусціл адну песню «Крыжыкі-нулікі», яна ўжо некалькі месяцаў гучыць на ўсіх радыёстанцыях. У хуткім часе выйдзе песня «Паўкрока да цябе», кантрасная кампазіцыя ў адносінах да першай песні. Цяпер эксперыментую з рэпертуарам, шукаю сябе. Пачаўся тур па Беларусі, ды і шмат канцэртных выступленняў не толькі ў межах яго. Планую вучыцца новаму і ўзнімаць планку якасці музыкі і індустрыі ў цэлым у Беларусі.

— Якія захапленні, акрамя музыкі, у цябе ёсць?

— Яна займае амаль усё жыццё. Я спяваю, іграю на фартэпіяна, вельмі шмат слухаю музыку. З іншых хобі: люблю кнігі, футбол, кіберспорт, але ў прынцыпе часу на гэта амаль не хапае.

— Якую параду хацеў бы даць моладзі?

— Не слухайце, калі вам кажуць, што тое, што вы робіце, няправільна і ў вас нічога не атрымаецца. Можа, і не атрымаецца, але вы хоць бы паспрабуеце і не будзеце потым шкадаваць пра ўпушчаную магчымасць. Часта бывае, што музыку і артыстаў, якіх не разумеюць сёння, могуць зразумець праз пэўны час, таму набярыцеся цярпення, вучыцеся, любіце сваю справу і верце ў сябе.

Ангеліна НОВІКАВА.
Фота дадзены героем публікацыі.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 24.08.2022 г.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства встроенных помещений гостиницы (без категории) в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

Информация о застройщике:
Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Местонахождение: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации:

в течение трех предшествующих лет ООО «СИ-трейдинг» как заказчиком строительства были построены следующие объекты, расположенные в д. Копище Минского района: жилой дом № 19/4 по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 10 месяцев; жилой дом № 1 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 22 месяца; жилой дом № 21Б по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 17 месяцев; жилой дом № 5 по Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 15 месяцев.

Информация об объекте строительства:
цели строительства – строительство многоквартирного жилого дома в составе объекта «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло» в г. Минске.

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:
начало строительства – апрель 2019 года;
окончание строительства – ноябрь 2022 года.

Результаты государственной экспертизы проектной документации:
положительные заключения государственной экспертизы № 1021-60/18 от 08.11.2018, № 1388-60/18от21.01.2019, № 1021-60/18-Д1 от20.02.2020г., № 422-60/21 от 15.07.2021, № 422-60/21-Д1 от 10.08.2021, выданные дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по г. Минску».

Сведения о месте нахождения объекта строительства:
местонахождение объекта строительства: Республика Беларусь, город Минск, Центральный район, ул. Гастелло. К объекту строительства примыкают: с севера – существующая среднеэтажная жилая застройка, с юга – ул. Гастелло и существующий сквер, с запада – существующая среднеэтажная жилая застройка и участок посольства Турции, с востока – существующая среднеэтажная жилая застройка и ул. Тарханова.

Характеристика объекта строительства:
проектной документацией предусматривается строительство жилого дома по ул. Гастелло (далее – «жилой дом») по индивидуальному проекту.

Жилой дом 10-этажный с двумя подземными уровнями, цокольным этажом, «теплым» техническим чердаком и встроенными помещениями общественного назначения имеет следующие основные показатели: количество секций – 4; количество квартир – 186 (в том числе однокомнатных – 106, двухкомнатных – 19, трехкомнатных – 54, четырехкомнатных – 7); гостиница на 11 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами; 6 административно-торговых помещений с отдельными входами; гараж-стоянка на 170 машино-мест.

Жилой дом расположен в центральном районе г. Минска. Транспортное обслуживание осуществляется с улиц Гастелло и Тарханова. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема жилого дома – монолитный железобетонный каркас с заполнением мелкоштучными кладочными материалами наружных стен. Здание имеет в каждой из секций по одному лифту.

Встроенные помещения гостиницы (без категории) запроектированы в цокольном (отметка -3,500) и на первом (отметка 0,000) этажах здания жилого дома. Предусмотрено размещение 11 гостиничных номеров и помещений для спортивных занятий.

На отметке -3,500: 6 номеров гостиницы, фитнес-зал, зал йоги, тренерская с санузлом и душевой, мужской и женский гардеробы с душевыми, санузлы, помещение горничных, уборочного инвентаря.

На отметке 0,000: вестибюль, рецепция, 5 номеров гостиницы (в том числе один гостиничный номер с санузлом, адаптированный к возможностям физически ослабленных лиц), административные помещения, помещение горничных с санузлом, кладовые чистого и грязного белья, уборочного инвентаря, санузел персонала.

Строительная готовность встроенных помещений гостиницы (без категории):
- внутренняя отделка – частичная: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;
- вентиляция – механическая вытяжная система с естественным притоком через окна (вентиляционные клапана);
- электроснабжение – установка электросчетчика, разводка электроосвещения с установкой выключателей, без установки розеток (за исключением 1 розетки под модем), без разводки электроснабжения;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель в гостиничных номерах, подключение и установка санитарно-технических приборов не предусмотрена;
- канализация – стояк, подключение и установка санитарно-технических приборов не предусмотрена;
- отопление – водяное, скрытая в полу разводка, отопительные приборы, частично теплые полы;
- окна – из ПВХ-профилей со стеклопакетом, витражи – из алюминиевого профиля со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в помещение, оптическая розетка;
- дверь входная – металлическая;
- система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре;
- разводка коммуникаций под установку домофонных устройств;
- система контроля и управления доступом на входных дверях, не обеспеченных разводкой под домофонные устройства.

Сведения о количестве объектов долевого строительства (встроенные помещения гостиницы), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

- встроенные помещения гостиницы общей площадью по проекту 1032,97 кв. метра. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади гостиницы составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1 000 долларов США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1 100 долларам США.

На предприятии действует система регулирования цены квадратного метра, зависящая от общей площади, типа планировки помещения, а также система скидок, зависящая от размера первоначального взноса и графика внесения платежей. Цена объекта долевого строительства (цена договора), установленная в договоре в привязке к иностранной валюте, является неизменной до окончания строительства, за исключением случаев, изменения цены объекта долевого строительства по соглашению сторон.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Условия заключения договора создания объекта долевого строительства:
оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % процентной оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации, в порядке очередного обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Со дня начала заключения договора создания объекта долевого строительства прием и регистрация заявлений на заключение договора осуществляются при заключении договоров. Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

В возводимом жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться предпочтение гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Данные о правах застройщика на земельный участок, собственнике земельного участка, его границах и площади, элементах благоустройства:
- земельный участок с кадастровым номером 500000000007008389, площадью 0,7774 га, предоставленный ООО СИ-трейдинг в аренду для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и поземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло», расположенного по адресу: г. Минск, район ул. Гастелло. Свидетельство (удостоверение) № 500/1355-12296 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 9 апреля 2019 года;
- земельный участок с кадастровым номером 500000000007008391, площадью 0,0175 га, предоставленный ООО СИ-трейдинг в аренду для строительства и обслуживания трансформаторной подстанции, расположенного по адресу: г. Минск, район ул. Гастелло. Свидетельство (удостоверение) № 500/1355-12297 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 9 апреля 2019 года;
- земельные участки с кадастровыми номерами 500000000007008597, 500000000007008598, 500000000007008599, площадью 0,1327 га, 0,0077 га, 0,0267 га соответственно, предоставленные ООО СИ-трейдинг в аренду для строительства транспортной инфраструктуры к объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и поземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло», расположенного по адресу: г. Минск, «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и поземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло». Свидетельства (удостоверения) №№ 500/1829-766, 500/1829-767, 500/1829-768 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 8 января 2020 года.

Проектом предусмотрено благоустройство придомовой территории, тротуаров, пешеходных дорожек, площадки для игр детей, сбора твердых бытовых отходов.

Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества: гостиница на 11 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами, 6 административно-торговых помещений с отдельными входами, машино-места в двух подземных этажах гаража-стоянки, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам: в состав общего имущества совместного домовладения, поступающего в общую долевую собственность всех дольщиков, входят фасад здания, помещения инженерного назначения (электрощитовая, тепловой пункт, лифтовые шахты, водомерный узел, насосная и т. д.), коридоры общего пользования, кладовые для уборочного инвентаря, лифты, лестнично-лифтовые холлы, межэтажные лестницы, тамбуры, конструкции: водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилого дома, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства (площадки для раздельного сбора бытовых отходов, уличные парковочные места, проезды, тротуары, детская площадка), а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения жилого дома. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации многоквартирного жилого дома и передаются застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода в эксплуатацию это товарищество создано. Если такое товарищество не создано, – лицу, определяемому общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: 01.11.2022 года.

Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком: договор строительного подряда № 15/03-2019 от 15 марта 2019 г., заключенный застройщиком со строительным унитарным предприятием «СИ-трейдинг-Строй».

Строительство осуществляется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

ООО «Фрондера»

извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «Трест Белстромремонт» в форме открытого аукциона

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб. (10 %)	Шаг аукциона, бел. руб. (5 %)
1	Вагон-бытовка (инв. № 14)	168,00	16,80	8,40
2	Вагон-бытовка (инв. № 724)	198,00	19,80	9,90
3	Вагон-бытовка (инв. № 418) + печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2	520,80	52,08	26,04
4	Вагон-бытовка (инв. № 423) + печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2	1 240,80	124,08	62,04
5	Автомобиль «Форд скорпио» 88-59	554,40	55,44	27,72
6	Фуговальный станок (инв. 467); долбежный станок (инв. 408); станок заточной (инв. 510)	1 072,80	107,28	53,64
7	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-60413, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Полярная, д. 2Д, площадь – 378,2 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административно-бытовое здание	190 800,00	19 080,00	9 540,00

В отношении лотов 1-2 проводятся девятые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 95 %.** В отношении лотов 3-4 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 70 %.** В отношении лотов 5-6 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 40 %.** В отношении лота 7 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 40 %.** Публикация об аукционе по всем указанным лотам ранее размещалась в газете «Звязда» № 112 (29734) от 10.06.2022, стр. 14

Дата и время проведения открытого аукциона	**7 сентября 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и оплаты задатка	С 10.00 **25 августа 2022 года** до 16.00 **5 сентября 2022 года**
Местонахождение имущества	Лоты №№ 1–6: г. Гродно, ул. Дубко, д. 11 Лот № 7: г. Витебск, ул. Полярная, д. 2Д

Условия для участия в торгах: 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Трест Белстромремонт», проводимых 07.09.2022.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по тел.: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – по лотам №№ 1–6 – 7 % (семь процентов), по лоту № 7 – 5 % (пять процентов) от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней (по лотам №№ 1–6) и в течение 14 (четырнадцати) рабочих дней (по лоту № 7) с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней (по лотам №№ 1–6) и не позднее 30 (тридцати) рабочих дней (по лоту № 7) со дня подписания договора. **Государственная регистрация договора купли-продажи по лоту № 7 и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.**

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться по телефонам: +375 29 589 41 34, Ольга Михайловна (по лотам №№ 1–6), +375 29 304 59 90, Дарья (по лоту № 7).**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, демонтажом и вывозом, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет

Продавец	Открытое акционерное общество «Трест Белстромремонт» (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», +375 29 304 59 90)
Организатор торгов	ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127

УНП 600010756

ООО «Фрондера» в газете «Звязда» № 160 (29782) от 17.08.2022 было размещено объявление о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис», назначенного на 30.08.2022 в 14.30. Торги в отношении Лота № 5 (станок шлиф 36151 шил., инв. № 709) отменены по решению продавца. Подробнее о торгах по телефону +375293042560.

УНП 600046563

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Зінаіда Дудзюк, якая, як і многія з яе калег, спачатку ярка заявіла пра сябе ў якасці паэткі, даўно вядомая аматарам беларускага прыгожага пісьменства і ў якасці адметнага празаіка. На творчым рахунку гэтага аўтара больш за дзясятак раманаў і аповесцяў, а таксама шматлікія апавяданні. Думаю, не памылюся, калі скажу, што адна з любімых тэм Зінаіды Дудзюк — наша гісторыя. У якасці прыкладу можна прывесці хоць бы яе раманы «Велясіты» (пра жыццё славянскіх плямёнаў на Балканах), «Год 1812» (назва гаворыць сама за сябе), «Кола Сварога» (своеасаблівая рэканструкцыя славянскай міфалогіі), «Слодыч і атрута» (гісторыя жыцця заходнебеларускай сям'і)... Апавяданне «Остарбайтар» таксама звязана з адной з нашай гісторыяй, якая настолькі глыбокай ранай засталася на сэрцы Беларусі, што, відаць, яшчэ доўга будзе здавацца, быццам усё гэта адбывалася зусім нядаўна.

Алесь БАДАК.

Зінаіда ДУДЗЮК

ОСТАРБАЙТАР

Апавяданне

Раман Кудлач выдзяляўся сярод вясковых равеснікаў вельмі густым і непаслухмяным рыжаватым чубам, які немагчыма было ні прыгладзіць, ні прычасаць. Рос хлопец шалапутным, у школе вучыўся так-сяк, зусім не таму, што быў няздатны да навукі, а проста нудна было яму сядзець над падручнікамі, калі столькі цікавых спраў чакаюць: футбол, рыбалка, грыбы, начны нагляд за канём і розныя іншыя справы. Да ўсяго маці трохі Рамана распесціла, калі бацька гатовы быў схапіцца за дзягу ды правучыць неслуха, заўсёды апраўдвала і бараніла адзінага сына — прадаўжальнік роду. Акрамя яго, у сям'і мелася яшчэ дзве малодшыя дачкі, якім даставалася ад брата шмат розных крыўдаў. Асабліва недалюбліваў ён сярэднюю сястру Таську, выдатніцу, якая штогод радавала бацькоў пахвальнымі граматамі са школы. Ёй прыдумваў самыя непрыемныя мянушкі, напрыклад, называў галаватаю за выдатную вучобу. Варта было Тасьцы паскардзіцца маці, што забалеў жывот, адразу атрымлівала новую мянушку: гнілапузая.

Калі Раман скончыў сямігодку, дык наважваўся пайсці вучыцца ў фабрычна-заводскае вучылішча, бо хацеў быць рабочым, пажадана токарам ці слесарам, такім умелым, як яго бацька, які ўсялякую рэч мог выштукарыць. Але ў чэрвені пачалася вайна і перакрэсліла ўсе намеры. Бацьку мабілізавалі на фронт, як пайшоў, дык не атрымалі ад яго ніякае весткі.

Вёска, у якой жыў Раман, стаяла на правым беразе Дняпра. Немцы тут добра заселі, проста на полі стаялі вялізныя гарматы. У 1943 годзе, калі фронт стаў набліжацца, фашысты асабліва пачалі лютаваць: вывозілі людзей у Германію, непаслухмяных расстрэльвалі, жыхароў вёсак штодня гналі капаць траншэі і акопы. Мясцовая моладзь старалася раніцай куды-небудзь схавацца, каб не патрапіць на вочы паліцаям. Раман цяпер быў адзіны мужчына ў сям'і, пачуваўся самавіта, да акупантаў ставіўся з пагардай і нянавісцю, а таму ніколі не хаваўся. Сухой травы натрэ, скруціць цыгарку з нямецкай абвесткі, сядзе на лаўцы каля весніц, закіне нагу на нагу і паліць, як дарослы. Калі і забяруць яго на грабарную працу, дык працаўнік з Рамана ніякі, толькі выгляд робіць, а сам калупаецца рыдлёўкаю на адным месцы, сочыць, ці нельга раней часу ўцячы.

У чарговы раз, калі пагналі Рамана капаць траншэі, босага ў падраных нагавіцах, ён, як звычайна, філоніў, паглядваў па баках. Раптам заўважыў, што адзін з немцаў-канваіраў прыцэліўся ў ката, які сядзеў на галіне вярбы. Узяў Раман каменьчык і спудзіў ката, не даў немцу праявіць сваю меткасць. Той паклікаў хлопца да сябе:

— Ком! Ком!

Падлетак наблізіўся. Немец знянацку тыцнуў яму пад правае рабро штыхом, прымацаваным да карабіна. Раман заліўся крывёю і зваліўся без прытомнасці. Да салдата падышоў афіцер, вылаяўся і сказаў, маўляў, Германія перажывае дэфіцыт рабочай сілы, а ты зарэзаў цывільнага, як мяснік, ды загадаў ахове тэрмінова завезці хлопца ў шпіталь.

Раман прачнуўся пад вечар у палаце, агледзеўся. Побач ляжала на ложках яшчэ чалавек пяць мужчын. У некаторых былі перавязаны галовы, у некаторых — усё тулава ў бінтах. Раман прыслухаўся да гаворкі, што далятала з кутка, і зразумеў: гавораць па-нямецку — вельмі спалохаўся, бо хадзілі чуткі, што немцы для сваіх параненых бяруць кроў у беларускіх дзяцей. Адразу ўзнікла думка: «Не дамся! Ні кроплі крыві не дам! Лепш прападу!» Толькі цяпер успомніў, што з ім здарылася, абмацаў свой забінтаваны бок, паглядзеў на далонь: крыві няма, здагадаўся, што рану зашылі.

У той жа момант у палату ўвайшоў санітар, наблізіўся да Рамана. Хлопец спалохана тузануўся да сцяны, але санітар супакоіў яго словамі: «Гут! Гут! Алес гут!» — ушпіліў укол у руку і выйшаў.

Да ночы ляжаў Раман ціха, баяўся паварушыцца ці азвацца, вельмі хацелася піць, здавалася, усё нутро высахла, ды раніцай усё ж падняўся. Хоць страшэнна балеў бок, але пайшоў пашукаць прыбіральню, там заадно вады напіўся і вярнуўся ў палату. Мабыць, тут ляжалі ў асноўным пацыенты, якім толькі зрабілі аперацыі, бо на другі дзень большасць параненых некуды перавялі, а на іх месца прывозілі на каталках новых, у большасці выпадкаў непрытомных, якія або маўчалі, або няўцямна стагналі.

Раман згадваў маці і шкадаваў, што яна ніколі не дазнаецца, куды падзеўся сын. Вельмі хацелася яму яшчэ хоць раз у жыцці пабачыць сясцёр. Ён думаў, што больш ніколі не будзе дражніць Таську, а наадварот, пачне бараніць ад хлопцаў.

Два дні ляжаў падлетак галодны, толькі хадзіў піць ваду ў прыбіральню, на трэці дзень пад вечар прынёс яму санітар кубак кіслага малака, на чацвёрты дзень дазволілі паесці ў сталоўцы. Праз тыдзень павыцягвалі ніткі з Раманавай раны, павялі на вакзал пад канвоем, штурхнулі ў таварны вагон, набіты беларускімі хлопцамі і дзяўчатамі. А там даведаўся, што вязе іх цягнік у Германію на работу. Спадарожнікі былі папярэджаныя і прыхапілі з сабой такой-сякой ежы, а Раману давялося галадаць, але нейкая дзяўчына злітавалася ды пачала дзяліцца хлебам. Паднявольную моладзь завезлі спачатку ў прыёмны лагер, а адтуль накіравалі на вялікі завод у Штутгарце, пасялілі ў адным з некалькіх цёмна-зялёных баракаў, агароджаных высачэзным плотам з калючага дроту. Каля брамы ў будцы заўсёды дзяжурылі ўзброеныя вартавыя. Новым работнікам выдалі каляныя сінія робы з блакітнаю нашыўкаю на грудзях з літарамі «OST» і абутак — драўляныя калодкі, ад якіх націраліся і вельмі балелі ногі. Раман тыдзень пад наглядам рабочага вывучаў такарны станок, а пасля пачаў працаваць самастойна. Змена доўжылася па дванаццаць гадзін, шэсць дзён на тыдзень, на завод і з завода хадзілі пад канвоем. Ежы, якую давалі ў лагернай сталоўцы, не хапала, той нішчымны суп, звараны невядома з чаго, не наталяў голад. У вольны дзень даваллася остарбайтарам выйсці ў горад. Яны стукаліся ў весніцы гаспадарам, каб за кавалак хлеба зрабіць якую работу, але найчасцей сытыя бюргеры спускалі на хлопцаў азвярэлых аўчарак. Наймітыі вымушаныя былі ўцякаць, толькі калодкі па бруку разляталіся.

Ад недаядання і цяжкай працы навальваліся на нявольнікаў хваробы. Некаторыя не вытрымлівалі і паміралі. Раман ацалеў, але палезлі на целе скулы, выпалі валасы, цяпер ніяк не апраўдваў ён сваё прозвішча Кудлач, бо праз год у свае пятнаццаць стаў зусім лысы, але пачаў галіць рэдзенькае шчаціннe на твары, выменяўшы ў знаёмай дзяўчыны на сцізорык брытву, якою яна абірала бульбу.

Хлопцу пашанцавала пазнаёміцца са стараватым немцам, панам Фогелем, які жыў на ўскрайку горада і даззваляў хлопцу папрацаваць за ежу, іншы раз даваў штонебудзь з адзення і абутку. Жонка гаспадара памерла, два сыны загінулі на Усходнім фронце, таму ён з непрыхаваным жалем глядзеў на Рамана, уздыхаў, напэўна, згадваў страчаных дзяцей. Дзякуючы гэтаму знаёмству хлопец выжыў. Аднойчы, каб аддзячыць хоць неяк, прынёс найміт пану Фогелю ўкрадзеныя на заводзе абцугі. Гаспадар вельмі спалохаўся і сказаў: «Ніколі не рабі гэтак. Калі дазнаюцца, цябе заб'юць. Я такую рэч магу сам сабе купіць. Занясі і пакладзі туды, дзе ўзяў...» Аднойчы Раман застаў пана Фогеля за дзіўным заняткам: той майстраваў белы сцяг і растлумачыў хлопцу, што наступаюць амерыканцы, трэба будзе здавацца. Тады і зразумеў остарбайтар, што вайна заканчваецца, Германія будзе пераможана, абклалі яе, як звера, з усіх бакоў. Апошнія дні перад вызваленнем былі жудасныя, горад часта бамбілі, асабліва па начах. Ахова замыкала баракі з паднявольнымі на ноч. Раман ляжаў на нарах, слухаў, як ляцяць самалёты, як грукаюць выбухі, і ўсё ніяк не верыў, што ўсё гэта скончыцца, што ён застанецца жывы. Ранкам, калі ахова ўцякла, выйшаў з барака, убачыў, што ля брамы стаіць танк з белай зоркай на баку, а на ім — амерыканскія салдаты. Ён не ведаў, што сказаць, як павітацца, таму проста стаяў і глядзеў на іх. Салдаты таксама нешта гаварылі, але Раман нічога не разумеў. Потым амаль пасаваў яму зялёны гарнітур. Цяпер можна было колькі заўгодна хадзіць па горадзе. Роман сноўдаўся па руінах, знайшоў чамадан і назбіраў такіх-сякіх рэчаў родным на гасцінцы. Нават трапіўся яму прыгожы насценны гадзіннік з анёламі, праўда, зламаны, але Раман быў перакананы, што бацька, як вернецца з вайны, наладзіць, не такі ўжо там складаны механізм. Цяпер кожны дзень здаваўся занадта доўгім, вельмі хацелася хутчэй вярнуцца дамоў, уяўляў, як узрадуюцца родныя, калі ўбачаць яго жывога: на працягу двух гадоў не меў ён магчымасці нават ліст ім паслаць, бо яны былі за лініяй фронту. А іншы раз ахоплівала хлопца трывога, ці выжылі родныя ў пекле вайны. Нарэшце атрымаў дазвол ехаць у Савецкі Саюз. Стаяў жнівень, на дварэ было горача, у вагоне — задуха, людзі адчынялі вокны, каб удыхнуць свежага паветра. Раман ляжаў на верхняй паліцы, пад галавой у яго быў чамадан з падарункамі, які ён старанна ахоўваў, вельмі ж хацелася не з пустымі рукамі з'явіцца дамоў пасля разлукі. На адной са стаянак ужо на тэрыторыі Польшчы Раман раптам адчуў, што чамадан памкнуўся з-пад галавы. Ён усхапіўся, успеў толькі згледзець, як нейкі злодзей з перона спрытна тузануў жалезным крукам ягоны скарб да сябе. Дарэмна лаяўся хлопец, праклінаў нямецкіх фашыстаў і польскага злодзея, але дапамагала гэта мала, давялося змірыцца са стратаю. У савецкім фільтрацыйным лагеры ў Брэсце рэпатрыянт Раман Кудлач хутка прайшоў праверку і нарэшце выехаў цягніком на радзіму. Выйшаў на патрэбнай станцыі на перон, пачуў родную гаворку, ажно сэрца зайшлося ад радасці. Здаецца, дзень і ноч слухаў бы гэтыя галасы. Потым амаль бягом пераадолеў трыццаць пяць кіламетраў да роднай дамоўкі. Дарога была разбіта ўшчэнт, з глыбокімі каляінамі, але пралягала яна проста праз ягоную вёску. І вось родная хата! Стаіць адна на ўскраіне, іншыя разваленыя ды спаленыя, адны коміны тырчаць. Забег у сенцы, адчуў знаёмыя пахі, адчыніў дзверы ў пакой, кінуўся ў абдымкі да маці, заплакаў і, каб не паказаць слёзы, выцер іх крадком. А тут і сёстры павіслі на ім, трохі падраслі за час разлукі, скубуць і гладзяць зялёны гарнітур. Ніколі ні да таго, ні пасля не зведаў Раман у сваім жыцці большага шчасця, чым ад гэтай сустрэчы. Глядзеў у матчын змарнелы і пастарэлы твар і не мог нагледзецца. Тады і даведаўся, што бацька на вайне загінуў. Пасля, як нагаварыліся ды наплакаліся, адзначылі для сябе сямейнікі, які спагадлівы і вытрыманы зрабіўся іхні брат і сын.

Раман Кудлач пражыў не надта доўгае жыццё, аднак паспеў дачакацца пенсіі. Даймалі яго прастуджаныя ў Германіі ныркі, з-за той хваробы і пайшоў заўчасна ў лепшы свет. У апошні шлях праводзілі яго родзічы і сваякі, між якімі былі жонка, сын і ўнук. Ляжаў ён у труне са стомлена заспакоеным тварам. Дух ягоны быў перакананы, што ёсць каму прадоўжыць род Кудлачоў.

Каб не знікла жамчужына Палесся


Капліца да рэстаўрацыі.

НА ЗЕМЛЯХ БЫЛОГА ФАЛЬВАРКА

Якоўчык тады расказваў, што застаў рэшткі парку ў зарасніку дзікага кустоўя, навокал буялі крапіва і лопух, валялася смецце. У сярэдзіне 1990-х усё гэта расчысцілі, прывялі тэрыторыю ў парадак. А калі кіраўнік гаспадаркі падняў дакументы, энцыклапедыі, даведнікі і ўпэўніўся, якой цікавай, неардынарнай была гісторыя Закозеля і навакольных вёсак, то літаральна «захварэў» гэтай тэмай. Дырэктар саўгаса некаторы час нават вёў факультатыў у школе па гісторыі свайго краю. Казаў, абурэнне ўзяло, што дзеці вучаць мінулае старажытных Грэцыі і Рыма, а вось што было ў ваколіцах Закозеля, і блізка не ўяўляюць. Мікалай Сцяпанавіч тады сабраў добры архіў па гісторыі роду Ажэшкаў, нават з нашчадкамі, якія жылі ў Парыжы, перапісваўся.

Закозельскімі землямі ў другой палове XIX стагоддзя валодалі Юзаф, Нікадзім, іншыя прадстаўнікі роду Ажэшкаў. Памесце ўключала ў сябе шэсць фальваркаў — Валавель, Белін, Дзятлавічы, Вавулічы, Карлавічы і Дошнік. Закозель быў галоўнай рэзідэнцыяй. Выгляд сядзібнага дома дайшоў да нас найбольш дакладна ў выглядзе акварэлі Напалеона Орды. Шмат разоў рэканструяваны, перароблены, удасканалены новымі гаспадарамі, дом быў спалены ў 1939 годзе. Да нашых дзён захаваліся будынак бровара, некалькі гаспадарчых памяшканняў ды сцены капліцы-пахавальні роду Ажэшкаў — галоўнай славутасці гэтых мясцін.

У Анатоля Федарука чытаем: «Капліца — рэдкае па кампазіцыі, гармоніі і якасці выканання, ляпным дэкоры, дэкаратыўным ліцці збудаванне і не толькі ў Беларусі. Пабудавана яна са светла-чырвонай цэглы. У плане цэнтрычны квадратны будынак са спічастымі двухскатнымі дахамі, пакрыты меднымі лістамі, у перакрыжаванні якіх уздымаецца ўгору чатырохгранная сігнатурка з вострым шпілем і чыгунным крыжом на канцы».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пахавальню ў 1849 годзе пабудаваў польскі архітэктар Францішак Яшчалд. На яго рахунку не адзін гэты шэдэўр, ёсць і іншыя, напрыклад палац Пуслоўскіх у Косаве. А з першага погляду на закозельскую капліцу многія чамусьці згадваюць Нотр-Дам. Можа, нават не падабенства, а нейкія матывы восемсотгадовага патрыярха гатычнай архітэктуры ўгадваюцца ў гэтай мініяцюрнай, зграбнай прыгажуні, якую даўно ўжо назвалі кветкай Палесся.

ГАРОТНЫ ЛЁС КАПЛІЦЫ

У скляпеннях капліцы-пахавальні ад пачатку была крыпта, дзе хавалі прадстаўнікоў роду. Дарэчы, графіня Бабрынская, якая пазней купіла маёнтак на аўкцыёне, прыняла ўмовы былых гаспадароў у адносінах да капліцы. Храм нельга было выкарыстоўваць у якіх-небудзь іншых мэтах, разбураць яго або перабудоўваць. І хоць сядзіба ў Ажэшкаў была канфіскаваная, фармальна ім пакінулі права хаваць членаў сям'і ў капліцы. Гэтым правам хацела скарыстацца адна з прадстаўніц роду — Эмілія Ажэшка, сын якой памёр у Парыжы ў пачатку мінулага стагоддзя, ды атрымала адмову ад расійскіх улад. На сваё шчасце. Але пра тое крыху пазней.

«Капліца — рэдкае па кампазіцыі, гармоніі і якасці выканання, ляпным дэкоры, дэкаратыўным ліцці збудаванне і не толькі ў Беларусі. Пабудавана яна са светла-чырвонай цэглы. У плане цэнтрычны квадратны будынак са спічастымі двухскатнымі дахамі, пакрыты меднымі лістамі, у перакрыжаванні якіх уздымаецца ўгору чатырохгранная сігнатурка з вострым шпілем і чыгунным крыжам на канцы».

Год таму.

Жыхаркай гэтых маляўнічых мясцін паўтара стагоддзя таму стала маладая Эліза Паўлоўская, якая ўжо паспела стаць Ажэшкай. Пасля вяселля з Пятром Ажэшкам яны прыехалі ў радавы маёнтак мужа Людвінова, што зусім побач з Закозелем. Будучая пісьменніца адразу занялася карыснай дзейнасцю, дапамагала хворым і гаротным, у 1861 годзе адкрыла для вясковых дзяцей школу. Паўстанне 1863—1864 гадоў Ажэшкі падтрымалі. Існавала версія, што менавіта ў гэтай капліцы, у патайным пакоі пад самым дахам, Эліза пэўны час хавала параненага Рамуальда Траўгута. Далейшая гісторыя вядомая, радавыя маёнткі Ажэшкаў былі канфіскаваныя і выстаўленыя на продаж. Пры новых гаспадарах Закозель стаў развівацца эканамічна, тут узвялі дрождажава-вінакурны завод, адкрылі іншыя невялікія вытворчасці.

...Тады, у 2008 годзе, мне давялося гутарыць таксама са сталым жыхаром вёскі Уладзімірам Хільке. Уладзімір Георгіевіч у свой час працаваў калгасным парторгам, жыў тут з 1955 года і шмат ведаў пра тутэйшую славутасць. Ад старажылаў чуў, што капліцу пачалі рабаваць яшчэ немцы падчас Першай сусветнай вайны, яны знялі меднае пакрыццё. Потым, у 1920-я гады, новы ўладальнік маёнтка адрамантаваў храм. А вось пасля Другой сусветнай святыня была разбурана і апаганена. Скляпенні раскопвалі, косці валяліся побач. Бывала, што Уладзіміру Хілько пасля чарговага налёту вандалаў даводзілася адпраўляць рабочых прыкопваць тыя косці.

І вось стала вядома, што атрыманы чарговы транш з фонду Прэзідэнта ў памеры 300 тысяч рублёў. Значыць, работа будзе паспяхова працягвацца. Амаль два гады капліца прастаяла ў рыштаваннях, а цяпер іх знялі, і палеская прыгажуня паўстае перад падарожнікам у сваім новым, хоць і не канчатковым, абліччы. Напарадзе яшчэ шмат спраў: ляпніна фасада, афарбоўка, добраўпарадкаванне тэрыторыі.

ПЕРШЫЯ КРОКІ

І вось, як той казаў, прыйшоў час збіраць камяні. Першыя крокі ў гэтым кірунку былі зробленыя два дзесяцігоддзі таму. У пачатку 2000-х спецыялісты ААТ «Брэст-Інспект» даследавалі капліцу і зрабілі заключэнне. Тэхнічны стан быў названы перадаварыйным, адзначалася, што магчымае нават раптоўнае абвальванне будынка. Тады ж адбылося і археалагічнае назіранне. Пад кіраўніцтвам дацэнта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра Башкова былі праведзены раскопкі, у працэсе іх знайшлі 46 адзінак артэфактаў, сярод якіх кавалак слуцкага пояса, чыгунныя літыя фрагменты інтэр'еру капліцы, часткі драўлянай разьбы, бронзавыя дэталі трун. Знаходкі перадалі абласному краязнаўчаму музею. Знайшлі і косці, якія пазней пахавалі побач з капліцай у адной магіле. Тады ж была зроблена пэўная работа па кансервацыі аб'екта, распачаты каштарыс. Адным словам, зрабілі столькі, колькі дазволілі сродкі, выдзеленыя аблвыканкамам.

Але на тым справа практычна і скончылася. Работы былі прыпынены надоўга з прычыны адсутнасці фінансаў. Некалькі ж гадоў таму стала ясна: калі не прыняць тэрміновыя меры, шэдэўр неагатыкі будзе страчаны. Аб'яўлялі нават збор грошай на аднаўленчыя работы, але сабраць многа не ўдалося. У 2019 годзе за кошт сродкаў, сабраных на рэспубліканскім суботніку, пачалі з супрацьаварыйных работ. Спецыялісты расчысцілі дах ад абломкаў, паставілі часовы, таксама зрабілі часовае пакрыццё скляпення, правялі дэмантаж чыгунных крыжоў.

ПАЎНАВАРТАСНАЯ РЭСТАЎРАЦЫЯ

І ўжо на наступны год дзякуючы фінансаванню з фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва прайшоў першы этап рэстаўрацыі капліцы. Дах быў адноўлены ў аўтэнтычным выглядзе, ён выкананы з медзі таўшчынёй у 0,6 міліметра і паўтарае першапачатковую канфігурацыю. Затым быў устаноўлены цэнтральны шасіметровы шпіль. На франтоны будынка вярнулі чыгунныя крыжы. Цікава, што іх рэстаўрацыю правялі на месцы, з гэтым справіліся работнікі Драгічынскага трактараремонтнага завода. Цэнтральны крыж, дарэчы, лічылі страчаным, але яго нечакана знайшлі падчас дэмантажу даху. І ён пасля абнаўлення вярнуўся на месца. Вышыня капліцы цяпер разам з крыжам складае 25 метраў.

Рэстаўрацыя паступова працягвалася. Была адноўлена паверхня цаглянага мура фасаду будынка, праведзена яго тынкоўка, устаноўлена 20 чыгунных агароджаў. Дарэчы, 18 з іх захаваліся, зрабіць давялося толькі дзве новыя. Кварцавым пяском без дэмантажу пачысцілі картушы з гербамі роду Ажэшкаў. Уставілі і 24 акенцы з вітражамі — над каляровым шклом працавалі спецыялісты «Брэстрэстаўрацыі», малюнак аднаўлялі па аскепках шкла, знойдзенага падчас работ.

